ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

№ 251 (3359) Пятніца, 1 лістапада 1929 г.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—819, кантора—781

Пасяджэньне сойму. К гэтаму часу ў кулуарах сойму зьявілася шмат афіцэраў і паліцэйскіх. У 4-й гадз. нечакана прыбыў у сойм Пілсудзкі, які патрэбваў адкрыцьця пасяджэньня. На гэта старшыня сойму Дашынскі, спасылаючыся на прысутнасьць у сойме значнай колькасьці вайскоўцаў і паліцэйскіх, адказаў, што пад пагрозай ваеннай сілы ён ня можа адкрыць пасяджэньне. Пасьля гэтага Пілсудзкі паехаў да прэзыдэнта. Пасяджэньне сойму адкладзена. Вайскоўцы і паліцэйскія працягваюць заставацца ў памяшканьні сойму.

Усесаюзны камітэт па сельска-гаспадарчаму забесьпячэньню машынамі выдзеліў Беларусі дадаткова дзесяць трактараў.

Загатоўка ільну—ў цэнтр увагі загатоўчых арганізацый і грамадзкасьці

Заклік партыі і ўраду—узмацніць загатоўку бульбы знайшоў гарачы водгук сярод працоўных БССР. Нарад Наркамгандлю СССР аб вывазе з Беларусі на працягу асеньняга пэрыяду 4-х мільёнаў пудоў бульбы на сёньняшні дзень ужо амаль цалкам выкананы. Хлебазагатоўчы плян мы выканалі каля 80 проц. Аднак, і ў гэтай галіне мы недастаткова нажымаем на Кулака.

Датэрміновае выкананьне пляну, узмацненьне нажыму на кулака, які ўхіляецца ад здачы лішкаў хлеба дзяржаве—вось задачы, над вырашэньнем якіх павінны і ў далейшым з непаслабнай энэргіяй працаваць нашы савецкія і партыйныя арганізацыі, наша грамадзкасьць.

Але, побч з гэтым, зараз асабліва трэба сканцэнтраваць увагу і, ў вядомай ступені, пераключыць на ходу энэргію загатоўчага апарату і грамадзкасьці на выкананьне другое базавое задачы дня—загатоўкі ільну.

У агульна-саюзным пляне загатовак ільну БССР займае вельмі значнае месца. Між тым, загатоўкі ў нас недапушчальна адстаюць.

Кастрычніцкае заданьне выканана пакуль толькі на 19 проц.

Надзвычайна дрэнна наступае закантрактаваны лён.

Усё гэта ставіць пад пагрозу ільнапрацоўчую прамысловасьць Саюзу. Невыканаьне пляну ільназагатовак можа адбіцца на выпуску мануфактуры, якая так патрэбна вёсцы.

Таму неабходна зараз-жа прыняць рашучыя меры да забесьпячэньня выкананьня пляну загатовак ільну, неабходна разгарнуць шырокую грамадзкую кампанію вакол гэтага пытаньня. Пляны загатовак ільну павінны быць даведзены да вёскі.

Кулацкім гаспадаркам трэба прад'явіць цьвёрдыя заданьні па здачы ільну на тых, хто ўхіляецца ад выкананьня гэтых заданьняў, трэба ўзьдзейнічаць грамадзкім і адміністрацыйным парадкам.

Гаспадарчым арганізацыям неабходна забясьпечыць сваячасовую пасылку хлеба ў ільнаводныя раёны і павялічыць завоз туды тэкстыльных тавараў.

Практыка пасылкі рабочых брыгад, якая дала вельмі добрыя вынікі ў часе хлебазагатоўчай кампаніі, павінна быць скарыстана і зараз.

Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на ўзмацненьне збору закантрактаванага ільну, на сваячасовае выкананьне кантрактантамі сваіх абавязацельстваў.

Мясцовыя партыйныя і савецкія арганізацыі павінны ўзяць пад кантроль работу загатоўчага апарату і забясьпечыць выкананьне пляну ільназагатовак у тэрмін.

Марудны тэмп загатовак ільну

Сельгаскаапэрацыя яшчэ нічога не зрабіла для спагнаньня закантрактаванага ільну

Плянам прадбачыцца загатаўленьне па БССР у бягучым годзе 13.600 тон ільнавалакна. Даныя, якія маюцца адносна ходу загатовак ільнавалакна па БССР за першыя дзьве дзесяціднёўкі кастрычніка, **сыгналізуюць пэўную небясьпеку на гэтай частцы загатоўчага фронту.** За ўвесь кастрычнік павінна быць нарыхтавана паводле пляну 750 тон ільнавалакна. За першыя-ж дзьве дзесяціднёўкі загатоўлена 131 тона.

Адстаюць усе загатоўцы. Асабліва сур'ёзна стаіць справа на лініі аспоўнага загатоўцы—сельска-гаспадарчай каапэрацыі, удзел якой у агульным пляне складае 57 проц.

Кантрактацыя, праведзеная сельска-гаспадарчай каапэрацыяй, займае паогул ва ўсім пляне загатовак ільну па БССР вельмі значнае месца—45%. Адсюль зразумела, што выкананьне кантрактацыі мае вельмі вялікае значэньне. Збор закантрактаванага ільну фактычна зьяўляецца найбольш лёгкай справай, тым больш, што кантрактанты атрымалі яшчэ ўлетку значную частку хлеба пад закантрактаваны ў іх лён. **Між тым, сельска-гаспадарчая каапэрацыя вельмі слаба разгортвае сваю працу і амаль нічога ня робіць для спагнаньня закантрактаванага ільну. Кантрактантам нават не ўспамінаецца аб неабходнасьці ўжо пачаць выкананьне абавязкаў па здачы ільну.** Да рэчы, лён сёлета ў нас пасьпеў, быў замочаны і пасланы раней, чым летась на 2-3 тыдні. Такім чынам сёлета можна і трэба было чакаць больш раньняга пачатку загатовак і здачы закантрактаванага ільну. Між тым гэтага няма. І спагнаньне кантрактацыі і загатоўкі адстаюць у сваім тэмпе ў параўнаньні з мінулым годам.

Ня могуць пахваліцца посьпехамі і іншыя загатоўцы—Белдзяржгандаль і Белкаапсаюз. За першыя 2 дзесяціднёўкі кастрычніка Белдзяржгандаль выканаў толькі 13,9 проц., а Белкаапсаюз—усяго 10,4 проц. сваіх месячных пляноў.

Такім чынам, трэба канстатаваць паўнейшую бязьдзейнасьць загатоўцаў у справе разгортваньня загатовак ільну.

Ня лепш і з мясцовымі партыйнымі і савецкімі арганізацыямі, якія не выяўляюць пакуль што ніякай зацікаўленасьці і ініцыятывы ў справе разгортваньня ільназагатовак.

Загатоўка і збор закантрактаванага ільну павінны прыцягнуць увагу партыйнай і савецкай грамадзкасьці і, у першую чаргу загатоўцаў, ня меншую, чым хлеба і бульбы.

Посьпех савецкай пяцігодкі разбурвае надзеі буржуазіі на стабілізацыю капіталізму

З АДОЗВЫ АНГЕЛЬСКАЕ ДЭЛЕГАЦЫІ Ў СССР

ПАРЫЖ, 31. У поўнач з 30 на 31-га кастрычніка выехалі з Лёндану ў СССР для ўдзелу ў сьвяткаваньні 12-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі ўдзельнікі ангельскай і ірляндзкай рабочых дэлегацый. Перад выездам з Лёндану ўсе ўдзельнікі дэлегацыі падпісалі адозву, у якой падкрэсьліваюць, што посьпех савецкай пяцігодкі высоўвае сацыялістычнае будаўніцтва ў СССР на першае месца сусьветнае гаспадаркі, а таксама парушае надзеі буржуазіі на стабілізацыю капіталізму.

Адзначаючы падрыхтоўку капіталістычных урадаў, у тым ліку і ўрад Макдональда, да вайны супроць СССР, адозва гаворыць: «У гэтай абстаноўцы мы выяжджаем у СССР, каб узмацніць сувязь пралетарскага адзінства, якое зьвязвае ангельскіх і ірляндзкіх рабочых з іх братамі ў СССР».

На чале дэлегацыі стаіць выдатны дзяяч рэвалюцыйнага рабочага руху Джордж Эйткін. У склад дэлегацыі ўваходзяць 10 жанчын-работніц. На параходзе адразу ўстанавіліся брацкія ўзаемаадносіны паміж дэлегатамі і камандай. Параход зойдзе ў Астэндэ, дзе прыме на борт удзельнікаў францускай рабочай дэлегацыі. (ТАСС).

АДСТАЎКА МАНТЭЛЯ

ПЭЙПІН, 28. Паводле вестак «Юнайтэд Прэс», амэрыканскі дарадца нанкінскага ўраду Мантэль (які ў свой час заставіў гаварыць аб сабе ў сувязі з яго няўдалымі заявамі аб аспадарцы К.-У. чыг.) тэлеграфаваў прэзыдэнту Чыянг Кай-шэку Сун-Фо, што ён не згодны з дагаворам кантракту, які канчаецца ў лістападзе і падае ў адстаўку. (ТАСС).

***

Мантэль нядаўна набыў для сябе няпрыемную вядомасьць агідным і хлусьлівым выступленьнем, у якім ён адважыўся сьцьвярджаць, што савецкая частка адміністрацыі К.-У. чыг. ледзь не займалася падробкаю справаздачнасьці гэтай чыгункі. Мантэль атрымаў належны і вычэрпваючы адказ у заяве нам. старшыні кіраўніцтва К.-У. чыг. Чыркіна; ён быў дэзавуіраваны дзяржаўным дэпартаментам і ўрэшце паліцыяй за лепшае фактычна забраць свае абвінавачваньні назад.

Апрача гэтых савецкіх экскурсаў, Мантэль зьяўляецца адным з самых даверaных агентаў буйнога амэрыканскага капіталу і яго прызначэньне на пасаду дарадцы нанкінскага ўраду ў свой час расцэньвалася сусьветнай палітыкай як адзнака рашучага курсу Амэрыкі на падтрыманьне нанкінскага рэжыму. Тыя абставіны, што Мантэль ня лічыць магчымым адзавіць свой кантроль, бязумоўна, адбіваюць ліквідатарскія настроі амэрыканскага імпэрыялізму, які расчараваўся ў славутай стабілізацыі Кітаю і лічыць за лепшае вярнуцца да сваёй ранейшай палітыкі вычаканьня. Паколькі гаміндана́ўскія заправілы ўскладалі ўсе свае надзеі іменна на падтрыманьне Амэрыкі, адстаўка Мантэля зьвяціла для іх цяжкім ударам.

1-га лістапада, а 18 гадзіне, у Доме Чырвонай армеі,
— АДКРЫВАЕЦЦА —
пленум Цэнтральнага Савету Асоавіяхіму БССР
Парадак дня:
1) Зацьвярджэньне пляну работы і бюджэту на 1929-30 г.
2) Разгортваньне працы па абавязковым і добраахвотным вайсковым навучаньні на 1929-30 г., і аб ахвяце вайсковай працай добраахвотнікаў.
3) Паветрана-хэмічная абарона.
4) Аб самаправерцы і сацыялістычным спаборніцтве Віцебскай арганізацыі.
5) Аб 4-й усесаюзнай лётарэі Асоавіяхіму.
Для ўдзелу ў пленуме актыў Менскай арганізацыі атрымлівае правускі ў Менскарсавет Асоавіяхіму.

Міністэрскі крызіс у Францыі

Грызьня ў лягэры сац.-фашыстых з-за міністэрскіх партфэляў

СКЛОКА СЯРОД САЦ.-ФАШЫСТЫХ

ПАРЫЖ, 30. Склока, якая разгарэлася ў верхавіне сацыялістычнай партыі вакол пастановы нацыянальнае рады аб удзеле ва ўрадзе, працягваецца і прымае ўсё больш вострыя формы. Па вестках «Юманітэ» пратэсты правых супроць падтасоўкі падліку мандатаў пры галасаваньні пытаньня аб удзеле ва ўрадзе не пазбаўлены падстаў. Знадворнаму адзінству партыі нанесены моцны ўдар. Частка партыі ідзе на адкрытае супрацоўніцтва з буржуазіяй, другая-ж частка партыі баіцца страціць усякую апору ў масах і таму адмаўляецца ад адкрытых форм суупрацоўніцтва з буржуазіяй.

***

ПАРЫЖ, 30. Пасьля закрыцьця пленуму нацыянальнай рады сацыялістычнай партыі адбылося паседжаньне парляманцкай фракцыі. Фракцыя большасьцю 43-х галасоў супроць 11 прыняла рэзалюцыю, у якой «выказвае жаль з поваду пастановы нацыянальнае рады, якая супярэчыць статуту і інтарэсам партыі».

Далей рэзалюцыя патрабуе скліканьня на 25-га сьнежня партыйнага зьезду, пацьвярджаючы, што галасы сацыялістычнай фракцыі забясьпечаны усякаму ўраду, які будзе праводзіць праграму рэформ і міру, агульную для ўсіх левых партый.

НЯМЕЦКІЯ САЦЫЯЛ-ФАШЫСТЫЯ РАСЧАРАВАНЫ

БЭРЛІН, 30. У колах нямецкай сацыял-дэмакратыі пастанова пленуму ЦК французкай сацыялістычнай партыі, якая выказалася супроць удзелу сацыялістых ва ўрадзе, паддаецца жорсткай крытыцы. Орган с.-д. партыі «Форвэртс» падкрэсьлівае, што пастанова ЦК партыі францускіх сацыялістых выклікала расчараваньне шырокіх колаў нямецкіх с.-д. Газэта адзначае, што француская сацыялістычная партыя зьяўляецца «часткова адказнай за тое, што ў Францыі будзе створаны яшчэ больш рэакцыйны ўрад, чым існаваўшы да гэтага часу».

САЦ.-ФАШЫСТЫЯ БАЯЦЦА СТРАЦІЦЬ МАГЧЫМАСЬЦЬ ДАЛЕЙ РАСКЛАДАЦЬ І РАЗБРОЙВАЦЬ РАБОЧУЮ КЛЯСУ

ПАРЫЖ, 30. «Юманітэ» зазначае, што, баючыся абурэньня рабочых і ў апасцы далейшага ўзмацненьня ўплыву кампартыі, правадыры сацыялістых падтасавалі вынікі галасаваньня нацыянальнай рады па пытаньні аб уваходжаньні ва ўрад. Страціўшы ўсякі кантакт з рабочымі масамі, сацыял-фашыстыя ня здолеюць ажыцьцявіць сваю работу па разлажэньні і разбраеньні рабочае клясы, а таксама весьці барацьбу супроць кампартыі, што, паводле прызнаньня Блюма, сацыялістыя лічаць сваёй асноўнай задачай.

Раз'яднаныя склокай і супярэчнасьцямі, і хутка ідучы па шляху перараджэньня і разлажэньня, сацыялістыя тым ня менш адзіны ў ненавісьці да кампартыі, адзінай партыі, якая кіруе барацьбою рабочае клясы і застаецца ў баку ад брудных парляманцкіх спраў.

Вэнгэрскія сацыял-фашыстыя кланяцца на вернасьць Бэтлену

ВЕНА, 28. Гэтымі днямі ў Вэнгрыі адбылася дэманстрацыя пратэсту рэвалюцыйнай рабочай моладзі супроць згоды сацыял-дэмакратыі з Бэтленам (гэтаю згодаю сацыял-дэмакраты абавязаліся падтрымліваць палітыку ўраду, ва што атрымалі абяцаньне аб павялічэньні ліку мандатаў). Дэманстрацыя праходзіла пад лёзунгамі: барацьба супроць фашызму і сацыял-фашызму, супроць імпэрыялістычнай вайны, за рабоча-сялянскую рэспубліку. Паводле вестак друку, паліцыі патрабавалася больш гадзіны для таго, каб разагнаць дэманстрацыю. Фашысцкі друк папракае сацыял-дэмакратаў у тым, што яны не сарвалі гэту дэманстрацыю. У адказ на гэтыя папрокі сацыял-фашыстыя пасьпяшылі запэўніць урад у сваёй поўнай адданасьці. Сацыял-дэмакратычны друк сьпяшаецца адмяжавацца ад удзельнікаў дэманстрацыі, заяўляючы, што ў гэтым «анты-ўрадавым выступленьні прымала ўдзел толькі палітычна адсталая моладзь, якая ня мае нічога агульнага з прынцыпамі сацыял-дэмакратыі». Сацыял-дэмакраты абіцаюць паклапаціцца аб тым, каб надалей нічога падобнага не паўтарылася.

Па апошніх вестках, паліцыя арыштавала 18 удзельнікаў дэманстрацыі, з якіх 16 потым былі вызвалены. Аднак, сьледзтва супроць іх працягваецца. (ТАСС).

Вынікі парляманцкіх выбараў у Чэха-Славакіі

ПРАГА, 29. Паводле афіцыйных даных на выбарах у парлямант было падана ўсяго 7.386.000 галасоў, партыі былой урадавай кааліцыі атрымалі 3.545.000 галасоў, апазыцыйныя партыі (акрамя камуністых) — 3.088 тысяч галасоў і камуністыя 753 тысячы галасоў. Такім чынам, партыі буржуазнай кааліцыі засталіся ў меншасьці. Па прыблізных падліках, у палаце дэпутатаў камуністыя атрымаюць 30 мандатаў (было 40), а ў сэнаце — 15 мандатаў (было 20).

Адбылася канфэрэнцыя камуністычнай партыйнай арганізацыі Прагі і ваколіц. Канфэрэнцыя ўхваліла рэзалюцыю, у якой адзначае, што камуністычная партыя, як паказалі вынікі выбараў, застаецца масавай партыяй, аднак, калі прыняць пад увагу палажэньне мас, дык вынікі выбараў трэба прызнаць няўдалымі для партыі, што тлумачыцца наліччам рэштак апартунізму ў радох партыі. Рэзалюцыя прапануе завастрыць барацьбу супроць ліквідатараў і прымірэнцаў, а таксама арганізаваць рабочыя масы на барацьбу супроць фашызму і сацыял-фашызму. (ТАСС).

ТАНКІ, ПУШКІ, САМАЛЁТЫ

Сапраўднае аблічча чэха-славацкіх сацыял-пацыфістых

ПРАГА, 24. Гэтымі днямі на вуліцах Прагі былі расклеены прадвыбарчыя плякаты нацыянальна-сацыялістычнай партыі, ад імя якой Бэнэш кляўся ў адданасьці «справе міру». Гэтыя плякаты рэзка супярэчаць мірным запэўненьням Бэнэша і яго прыхільнікаў. Адзін з гэтых плякатаў з надпісам: «На абарону нашай маемасьці і крыві» асабліва красамоўны. На плякаце намалёваны ўзброены ад ног да галавы кавалерыст, улева ад яго — танк, які разбурае дротавыя загародкі, наверсе — самалёт. На правым баку пляката відны пушкі і кулямёты, накіраваныя ў бок самалёту.

Адначасова друк паведамляе аб тым, што ў Празе мае адбыцца адкрыцьцё школы грамадзянскай авіяцыі. На гэту школу міністэрства грамадзкіх работ выдае 500 тыс. чэскіх крон (чэская крона — 6 кап.). У абавязкі кіраўніцтва школай уваходзіць ня толькі кіраўніцтва навучальнай часткай, але і закупка авія-матар'ялаў. Школа адкрывае свае аддзяленьні ў радзе гарадоў Чэха-Славакіі: у Пільзэне, Егэры, Прастэйне, Алумоўцы (абодва ў Маравіі) і інш. У арганізацыі школ прымаюць бліжэйшы ўдзел «аэра-клюб чэха-славацкай рэспублікі», «ліга авіяцыі імя Масарыка», «саюз чэха-славацкіх лётнікаў».

Камуністычны друк бачыць у арганізацыі гэтай школы новы довад падрыхтоўкі Чэха-Славакіі да вайны.

Масква—Нью-Ерк

«Краіна Саветаў» набліжаецца да Нью-Ёрку. Вялізарны пералёт у 20 тысяч кілёмэтраў канчаецца. З напружанай увагай сачаць усе працоўныя СССР, усе нашы ворагі і прыяцелі за першай савецкай сталёвай птушкай, якая паявілася над сусьветнымі цэнтрамі далёкай Амэрыкі. Вакол пералёту разгортваецца барацьба, і супярэчнасьць эканамічных інтарэсаў розных капіталістычных груп зноў расколвае адзіны буржуазны фронт варожасьці ў адносінах да ўсяго таго, што зьвязана з імем савецкага краю.

Ангельская і француская прэса прабуюць проста ўтаіць ад чытача самы факт пералёту. Ангельскі «Таймс», самая буйная газэта Эўропы, на працягу ўсяго апошняга месяца прысьвяціў пералёту толькі 4 радкі самым дробным шрыфтам у самым нізе аднэй з сваіх вялізарных старонак. Але амэрыканская прэса шумна ліквідуе гэту эмову маўчаньня. **Амэрыканскія газэты надаюць пералёту вялікую ўвагу, прысьвячаюць яму вялізарныя артыкулы, друкуюць падрабязныя паведамленьні, карэспандэнцыі, фатаграфіі. Амэрыканскі друк вітае савецкіх лётнікаў, прызнае вялізарнае дасягненьне савецкай авіяцыі і абвяшчае іх буйнейшым укладам у справу разьвіцьця сусьветных паветраных зносін.**

Найбольшае значэньне ў гэтых адносінах мае, бязумоўна, пералёт «Краіны Саветаў» праз паўночную частку Ціхага акіяну, па маршруце Нікалаеўск на Амуры—Петрапаўлаўск на Камчатцы—выспа Атту—выспа Уналашка-Сюард на Алясцы—выспа Сітка—порт Сіэтль у штаце Вашынгтон (Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты).

Скалістыя Аляўцкія выспы (Атту, Уналашка і цэлы рад іншых), якія цягнуцца паўкругам паміж нашым і амэрыканскім берагамі Ціхага акіяну, на першы погляд прадстаўляюць сур'ёзную выгаду для палёту па гэтым маршруце. Але ў сапраўднасьці яны крыюць у сабе вялізарную небясьпеку для лётніка. Скалісты характар выспі не дае амаль ніякай магчымасьці пасадкі для сухапутнага самалёту. А самалёт на паплаўках заўсёды рызыкуе разьбіцца пры пасадцы аб падводныя рыфы. Раён Аляўцкіх выспі амаль увесь час зацягнуты густым туманам. Нарэшце бурныя вятры, якія дзьмуць тут па крыжуючых кірунках, стараюць небясьпечныя паветраныя вадавароты, падымаюць сьмерчы (вадзяныя слупы) і іншыя чыгунаў. Зазначаючы на гэтыя прыродныя ўмовы і бяручы пад увагу няўдалыя спробы цэлага раду лётнікаў, многія амэрыканскія знаўцы авіяцыі схільны былі лічыць, што палёт праз паўночную частку Ціхага акіяну наогул немажлівы. **Пералёт «Краіны Саветаў» упяршыню паказаў, што ён магчымы.**

Многім здавалася, што пералёт «Краіны Саветаў» адбываецца вельмі марудна, што савецкія лётнікі церпяць няўдачу. Але трэба мець на ўвазе, што савецкія лётнікі **першыя прабівалі паветраны шлях там, дзе ён здаваўся невыабражальным, прабівалі яго ў шалёнай барацьбе з перашкодамі, якія лічыліся непераможнымі.** Ім прыходзілася пільна сачыць за рухам тайфунаў з тым, каб праскочыць чарговы этап пералёту ў той момант, калі адзін тайфун ужо канчаўся, а другі яшчэ не пачынаўся. І ім прыйшлося ўласным вопытам рашаць пытаньне, на якое ніхто ня мог наперад адказаць, а іменна: пытаньне аб тым, ці хопіць у самалёту сілы справіцца з паветранымі вадаваротамі і ці ўдасца самалёту ўнікнуць падводных рыфаў пры пасадцы ля скалістай Уналашкі.

Пры гэтых умовах належыць толькі дзівіцца таму, што самалёт меў усяго толькі адну вымушаную пасадку на шляху паміж Сіткай і Сіэтлем. Да таго-ж, як **асабліва падкрэсьлівае амэрыканская прэса, акалічнасьці гэтай вымушанай пасадкі самі на сабе зьяўляюцца вялізарным дасягненьнем сусьветнай авіяцыі.** Магчыма, што упяршыню за ўсю гісторыю авіяцыйнае справы вялізны самалёт патрафіў сесьці на надта абмежаванай паверхні возера ля вытокі вадападу. Памылка на якіянебудзь 5-10 мэтраў і самалёт быў-бы дашчэнту разьбіты аб каменьні. Таксама упяршыню за ўсю гісторыю авіяцыі лётнікі змаглі замяніць пасаджаны матор другім без спэцыяльна абсталяванага аэрадрому.

Тая акалічнасьць, што гэта зрабілі савецкія лётнікі, што паветраны шлях праз паўночную частку Ціхага акіяну быў упяршыню адкрыты лётнікамі СССР на самалёце савецкай канструкцыі і савецкай вытворчасьці, зьяўляецца фактам вялізнага палітычнага значэньня.

Кіруючая газэта амэрыканскай буржуазіі «Нью-Ёрк Таймс» робіць надзвычайна важную ў гэтых адносінах заўвагу. Малюючы вымушаную пасадку ля вадападу, газэта зазначае, што гэта быў «Усякі лётнік,—піша газэта,— перш за ўсё думаў-бы аб уласным выратаваньні. Аднак усе акалічнасьці паказваюць, што лётнікі «Краіны Саветаў» нават у гэты момант думалі **ня толькі аб уласным выратаваньні, але і аб тым, як-бы захаваць самалёт у цэласьці і забясьпечыць магчымасьць працягваньня палёту. Гэта робіць гонар мужнасьці, самысьлівасьці, самаўпаданьню і сьвядомасьці сваіх абавязкаў савецкім лётнікам.**

Пералёт «Краіны Саветаў» наогул ва многім зьяўляецца дзіўны для амэрыканскай буржуазіі. У Амэрыцы надзвычайна мала ведаюць аб СССР. Хлусьня, якую звычайна распаўсюджваюць ад нас буржуазныя газэты ўсіх краёў, нарэшце ўводзіць у заблужэньне і тых, хто яе распускае. Іменна таму славуты палёт Чухноўскага ў мінулым годзе, які выратаваў групу Мальгрэма, выклікаў сапраўднае зьдзіўленьне ў Амэрыцы. Але гэтае дасягненьне савецкай авіяцыі адбылося далёка ад амэрыканскіх берагоў. Ніхто ня бачыў ні Чухноўскага, ні яго самалёту. **«Краіна Саветаў» прайшла над тэрыторыяй Злучаных Штатаў каля 5.000 кілёмэтраў.** Яна пранеслася над самымі далёкімі штатамі самай глухой амэрыканскай правінцыі. Савецкі самалёт аглядалі тысячы людзей. Вялізарныя дасягненьні савецкай авіяцыі і, значыць, савецкага будаўніцтва наогул, становяцца ад гэтага часу бясспрэчным фактам для амэрыканскай буржуазіі (для амэрыканскага пралетарыяту яны даўно ўжо зьяўляюцца бясспрэчнымі).

Трэба мець на ўвазе, што за апошні час у Амэрыцы наогул расьце ўзмоцненая зацікаўленасьць да СССР. Амэрыканскія газэты і часопісі ўдзяляюць шмат увагі нашай краіне. Пералёт «Краіны Саветаў», тыя ўрачыстыя спатканьні, якія рабіліся савецкім лётнікам ва ўсіх амэрыканскіх гарадох, з аднаго боку, сьведчаць і аб узмоцненай зацікаўленасьці да СССР, а з другога—яны гэту зацікаўленасьць яшчэ больш павышаюць, узмацняючы новымі сокамі ўзрастаючы рух за збліжэньне з Савецкім Саюзам.

І. С.

Галадоўка палітвязьняў у Вэнгрыі працягваецца

Турэмныя каты нячуваным тэрорам стараюцца задушыць галадоўку

ВЕНА, 29. З Будапэшта паведамляюць, што галадоўка палітзьняволеных у вэнгерскіх турамх працягваецца. Афіцыёзныя ўпэўненьні быццам сацыял-дэмакратычныя і беспартыйныя зьняволеныя спынілі галадоўку—хлусьлівыя. Палітзьняволеныя ў акруговай турме Будапэшту забарыкадаваліся ў камэрах, каб выратавацца ад мук штучнага кармленьня. Варта сілаю ўрывалася ў камэры. Палітзьняволеныя пакараны адсылкаю на тыдзень у цёмны карцэр і пазбаўленьнем на 3-хмесячны тэрмін права спатканьняў, перапіскі і чытаньня кніжак. Турэмнае кіраўніцтва пагражае прыстасаваньнем новых рэпрэсій.

***

ВЕНА, 29. 25-га кастрычніка ў Будапэшце і іншых гарадох Вэнгрыі распаўсюджваліся лятучкі кампартыі, якія патрабуюць спыненьня катаваньняў у паліцыі і турмах, выкананьня патрабаваньняў палітзьняволеных і ўсеагульнай амністыі. 26-га кастрычніка перад турмой у Будапэшце некалькі сот рабочых бурнымі крыкамі пратэставалі супроць турэмных жорсткасьцяй і патрабавалі амністыі. Паліцыі ледзь удалося разагнаць дэманстрантаў. Зроблены рад арыштаў. (ТАСС).

ПРАТЭСТ СУПРОЦЬ ТЭРОРУ Ў ВЭНГЕРСКІХ ТУРМАХ

ВЕНА, 30. Як падаюць з Будапэшту, галадоўка палітзьняволеных працягваецца ў поўным аб'ёме. Бэтлен учора атрымаў пратэст ад раду дзеячоў захаду, якія дамагаюцца задаваленьня патрабаваньняў палітзьняволеных. (ТАСС).

Сац.-фашыстыя раяць паліцыі ўжываць гумовыя палкі

БЭРЛІН, 28. Паводле вестак з Амстэрдаму, у Галяндзкай палаце дэпутатаў абгаворвалася пытаньне аб крывавых сутычках паміж паліцыяй і баставаўшымі рабочымі на бялільных фабрыках у Маастрыхце. Як вядома, у часе гэтай забастоўкі многія рабочыя былі цяжка паранены паліцыяй і адзін з іх хутка памёр ад атрыманых ран.

Пры абгаварэньні пытаньня ў палаце прадстаўнікі сацыял - дэмакратычнай партыі не выступалі супроць паліцэйскіх зьдзекаў наогул, але толькі паказвалі, што паліцыі ня трэба было ўжываць агнястрэльнае зброі, бо яна магла абмежавацца гумовымі палкамі.

Забастоўка гарнякоў ў Дэрэме

ЛЁНДАН, 31. У каменнавугальных капальнях кампаніі Хартон у Дэрэме забаставала звыш 2.500 горнарабочых. Прычынай забастоўкі зьяўляецца нявыплата кампаніяй ставак зарплаты, якія вызначаны ў дагаворы.

4.000 рабочых выкідаюцца на вуліцу

ЛЁНДАН, 31. Сталяліцейная кампанія Бэйд паведаміла, што з прычыны недахопу заказаў праз тыдзень ўсе прадпрыемствы кампаніі перастануць працаваць, у сувязі з чым пазбаўляюцца работы звыш 4.000 рабочых.

Заканчэньне забастоўкі Бэрлінскіх трубапракладчыкаў

БЭРЛІН, 28. Пасьля 10 тыдняў гэрачнае барацьбы на ўчарашнім агульным сходзе бастуючых бэрлінскіх трубапракладчыкаў прынята пастанова аб спыненьні забастоўкі. Стачачны камітэт будзе, аднак, працягваць сваё існаваньне, каб адбіць ўсялякія спробы прадпрыемцаў звольніць актыўных узельнікаў забастоўкі, альбо прыняць супроць іх якія-небудзь іншыя меры.

«Ротэ Фане» заклікае рыхтавацца да новай барацьбы супроць капіталу разам з усімі клясава-сьвядомымі рабочымі.

РАСПАД ГРУПЫ БРАНДЛЕРА

БЭРЛІН, 28. Апошнія наяўна сацыял-дэмакратычныя выступленьні прадаўсірсў брандлераўцаў садзейнічаюць распаду брандлераўскай групы. Рад асоб, якія ішлі да гэтае пары за Брандлерам, зьвярнуліся ўжо да Нямецкае кампартыі з просьбаю прыняць іх назад у партыю.

РАБОЧЫ РУХ НА ЗАХАДЗЕ

ЭКСПЛЁАТАЦЫЯ ЖАНОЧАЙ ПРАЦЫ У АУСТРЫІ

ВЕНА, 31. Жаночая сэкцыя рабочай камэры ў Вене апублікавала мэмарандум аб жаночай працы ў Аўстрыі. Адначасова інспэкцыя прамысловасьці апублікавала аналітычны даклад, які зьмяшчае некалькі красамоўных лічбаў і фактаў. Абодвы дакументы—як рэфармісцкі, так і афіцыйны—адрозьніваюцца наяўнай тэндэнцыяй—падкрэсьліць «высокі ўзровень» сацыяльнага заканадаўства ў Аўстрыі. Ня гледзячы на гэту тэндэнцыю вы зьмяшчаюць цікавыя даныя аб эксплёатацыі жаночае працы.

У Аўстрыі маецца рад катэгорый працоўных жанчын, якія зусім пазбаўлены аховы мацярынства. Да гэтых катэгорый належаць ранейшае ня ўсё хатнія работніцы, батрачкі, пралкі, сэзонныя работніцы і беспрацоўныя жанчыны, якія часта атрымліваюць толькі пэнсію на кармленьне. Справаздача інспэкцыі падае падрабязнасьці аб тым, якую цяжкую работу прыходзіцца выконваць цяжарным жанчынам У выніку—поўнае паслабленьне арганізму. З 12 няжывых нараджэньняў 7 тлумачацца нашэньнем цяжкасьцяй і 5 напружаным становішчам цела ў часе работы.

Выбух у будынку віленскага ваяводзтва

ВАРШАВА, 31. Як паведамляюць з Вільні, у будынку Віленскага ваяводзтва здарыўся выбух, у выніку якога была разбурана частка памяшканьня. Пра прычыны выбуху пакуль што нічога не вядома. (ТАСС).

Рэпрэсіі ў сувязі з гадавінаю Кастрычніцкае рэвалюцыі

ВАРШАВА, 31. У сувязі з падрыхтоўкаю да сьвяткаваньня 12-ае гадавіны Кастрычніцкае рэвалюцыі ўрад прадпрыняў рад рэпрэсійных мер.

У Пазнані арыштаваны старшыня саюзу транспартнікаў Гувард, які абвінавачваецца ў тым, што ён нібы праз Данцыг езьдзіў у СССР, а цяпер вярнуўся ў Польшчу, каб арганізаваць сьвяткаваньне 12-ае гадавіны Кастрычніку.

Разам з Гувардам арыштавана яшчэ 9 чал. (ТАСС).

Прысуд за належнасьць да камсамолу

ВАРШАВА, 31. У Лодзі слухалася справа 24-х па абвінавачаньні ў прыналежнасьці да камсамолу. У якасьці сьведак выступалі выключна паліцэйскія і тайныя агенты. Сьведкі абвінавачаньня паказвалі, што падсудныя займаліся агітацыяй. Суд прыгаварыў 2-х да 5 г. зьняволеньня, 19 падсудных да зьняволеньня на розныя тэрміны. Трое апраўданы. (ТАСС).

Катаржны прысуд у Дзісьне

ВІЛЬНЯ, 30. Віленскі акруговы суд 24-26 кастрычніка разглядаў справу 12 жыхароў Дзісьненшчыны (Зах. Беларусь) па абвінавачаньні ў прыналежнасьці да кампартыі Заходняе Беларусі. Ян Аніськовіч засуджаны на 6 год катаргі, Б. Лагун, Ф. Квач і Х. Цэйталь — на 4 гады, Ю. Хаданёнак, Я. Сьмярцееў і М. Судзік — на 2 гады, К. Кубарка і В. Хаданёнак — на 11 месяцаў. Трое апраўданы. («К. Віл.»).

Марскія ўзбраеньні фашысцкай Італіі

РЫМ, 30. З прычыны апублікаванага ў афіцыйным друку дэкрэту італьянскага ўраду аб павялічэньні з 400 да 600 мільёнаў лір асыгнаваньняў на пабудову новых ваенных суднаў, «Кар'ера Дэлля Сэрра» піша: «Асыгнаваньне павялічваецца ў сувязі з тым, што ў чэрвені пачалася пабудова 2-х крэйсэраў па 10 тыс. тон, 2-х крэйсэраў па 5½ тыс. тон, 4 контр-мінаносцаў і 4 падводных лодак, прадугледжаных судна-будаўнічай праграмай у студзені бягучага году.

Прыцёк міжнароднага капіталу ў Латвіі ўзмацняецца

РЫГА, 28. Латвійскі ўрад, відавочна, дагаварыўся аб новай замежнай пазыцы. Пазыка будзе зроблена ў Галяндыі пад залог тутэйшае манаполіі. Друк паведамляе, што рыскі банк замежнага крэдыту выпрашуў перабудавацца ў акцыянэрны банк, у якім прымуць удзел нямецкія і амэрыканскія капіталы. Гэтыя факты сьведчаць аб тым, што прыцяканьне міжнароднага, а прыватнасьці амэрыканскага, капіталу ў Латвію за апошні час узмацняецца.

Па Савецкім Саюзе

КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ РАДУ РАЁНАЎ ЛЕНІНГРАДСКАЙ ВОБЛАСЬЦІ

ЛЕНІНГРАД, 30. Адбыўся зьезд прадстаўнікоў буйнейшых калгасаў. На зьезьдзе высьветлілася, што ў вобласьці пачата работа на масавай калектывізацыі раду раёнаў. У Валокским раёне, Баравіцкае акругі, калектывізуецца 103 населішчы. У Чарапавецкай акрузе калектывізуецца ўвесь

Па СССР

„ЧЫСТКА"

Ідэя чысткі савецкага апарату шырока ўсьвядомлена працоўнымі масамі, яна знайшла адлюстраваньне і ў мастацтве. На здымку фігура выразаная на пні дрэва разьбяра-селяніна Цьвярской губ.

Тав. Мікаян аб ходзе хлебазагатовак

МАСКВА, 30. Гэтымі днямі ў калёнай залі Дому Саюзаў адбыўся сход хлебазагатоўшчыкаў, на якім Наркамгандаль СССР т. А. І. Мікаян зрабіў наступнае паведамленьне аб ходзе хлебазагатовак:

«Вягучы год пасьля крызісу хлебазагатовак за папярэднія два гады—зьяўляецца пераломным. Плян сацыялістычнае рэканструкцыі збожжавае гаспадаркі, прыняты партыяй і савецкай уладай зрабіў уплыў на хлебазагатоўкі ў бягучым годзе. Хлебазагатоўкі па Саюзе ідуць здавальняюча. Пастаўленая ўпачатку кампаніі задача—скончыць хлебазагатоўкі да студзеня-лютага месяца зусім выканальна.

З лістапада павінна быць распачата генэральная праверка выкананьня абавязацельстваў усіх калгасаў, саўгасаў і закантрактаваных гаспадарак. Хлебазагатоўкі, якія праходзяць у атмасфэры вострай клясавай барацьбы, суправаджаюцца хістаньнямі сярод асобных часьцей нашага апарату і партарганізацый праяўленьнем правага ўхілу на практыцы. Партыя вядзе і павінна весьці рашучую барацьбу з усякімі праяўленьнямі правага ўхілу, як галоўнейшай небясьпекай для нашай партыі і для лёсу сацыялістычнага будаўніцтва. Аднэй з асноўных умоў пасьпяховага сканчэньня хлебазагатовак зьяўляецца рашучая барацьба з хлебнымі спэкулянтамі і канкурэнцыяй паміж каапэрацыйнымі і дзяржаўнымі загатоўшчыкамі.

Аднак, яшчэ ня ўсюды вядзецца рашучая барацьба са спэкулянтамі і канкурэнцыяй паміж загатоўшчыкамі. Мы навінны, апіраючыся на мэтады кантрактацыі, як форму вытворчай змычкі з сялянствам, ісьці па шляху арганізацыі сацыялістычнага прадукту абмену паміж горадам і вёскай». (ТАСС).

ПАСТАНОВА СНК СССР АБ УДАЛЯЧЭНЬНІ ЎМОЎ КРЭДЫТАВАНЬНЯ БЯДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК

МАСКВА, 30. СНК СССР прыняў рад пастаноў аб палячэньні ўмоў крэдытаваньня бядняцкіх гаспадарак. Саюзны Саўнарком штогодна будзе вызначаць якая частка са сродкаў, вызначаных на крэдытаваньне індывідуальных сялянскіх гаспадарак па сыстэме сельска-гаспадарчага крэдыту, павінна быць абавязкова выдана бядняцкім гаспадаркам.

Бядняцкім гаспадаркам, апрача таго, будуць давацца крэдыты і з фондаў крэдытаваньня вясковае беднаты, якія існуюць ў сыстэме сельска-гаспадарчага крэдыту.

СНК Саюзных рэспублік паказала, што пазыкі з фондаў крэдытаваньня вясковай беднаты павінны выдавацца на тыя-ж тэрміны, на тых-жа ўмовах, што і пазыкі з агульных крэдытаў.

НОВАЕ МЕСЦАНАРАДЖЭНЬНЕ НАФТЫ НА КАЎКАЗЕ

У Гурыі (Заходняя Грузія), у пасялішчы Омпэрці, з аднае прабоіны нечакана стала выцякаць нафта. У першы дзень сабрана каля 4 тон. Гэта—першы выхад нафты ў Гурыі. Туды выехала спэцыяльная камісія.

Партыйнае будаўніцтва

Генэральная праверка радоў партыі

Чыстка ўзьняла клясавую баяздольнасьць партыйных арганізацый ў барацьбе з правым апартунізмам, прымірэнцтвам і „левымі" наскокамі на лінію партыі

Сваячасова выпраўляючы памылкі і недахопы праверачнай работы, правядзем чыстку партыі пад знакам выкананьня асноўных задач партыі і шырока разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі

Папярэднія вынікі праверкі і чысткі КП(б)Б

Гутарка з старшынёю ЦКК КП(б)Б тав. Калініным

Зараз пасьля сканчэньня чысткі кіраўнічых кадраў і вясковых арганізацый КП(б)Б можна зрабіць некалькі вывадаў і заўваг, каб падагуліць вынікі гэтай важнейшай палітычнай работы.

Падрыхтоўчая работа

КП(б)Б пачала рыхтавацца да чысткі партыі адразу пасьля лістападаўскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б). Акруговыя партарганізацыі разгарнулі работу па вывучэньні і папулярызацыі пастановы пленуму, завастрыўшы асаблівую ўвагу на падрыхтоўцы да генэральнай чысткі партыі. Па лініі ЦКК КП(б)Б на месцы былі разасланы інструкцыйныя лісты і ўказаньні, у якіх даваўся рад практычных прапаноў і мерапрыемстваў па правядзеньні падрыхтоўчай работы і расглумачваліся асноўныя задачы і палітычныя прынцыпы праверкі і чысткі партыі.

Пасьля 12-га зьезду КП(б)Б (люты 1929 г.), які зьвярнуў вялікую ўвагу на пытаньні чысткі партыі і вынес рад прынцыповых пастаноў, падрыхтоўка да чысткі была праведзена на рэйкі канкрэтнай практычнай работы. Акруговыя КК прыступілі да падбору праверачных камісій, раённыя камітэты партыі склалі характарыстыкі на парт'ячэйкі і г. д.

У асноўным падрыхтоўчая работа ў КП(б)Б была праведзена здавальняюча. Гэта пацьвярджае хаця-б такі факт, што партыйныя арганізацыі і асноўныя масы працоўных гораду і вёскі правільна ўсьвядомілі палітычныя задачы праверкі і чысткі партыі. Але ў радзе раённых арганізацый падрыхтоўчая работа была праведзена павярхоўна, бяз глыбокай прапрацоўкі пытаньняў надыходзячай чысткі і без дэтальнага вывучэньня канкрэтных матар'ялаў.

Праверка кіраўнічых кадраў

Практычна чыстка КП(б)Б пачалася ў чэрвені 29 г. з праверкі кіраўнічых кадраў кампартыі Беларусі.

Нельга не адзначыць тое вялізнае давер'е партыі, якое прадэманстравалі працоўныя масы пры праверцы кіраўнічых кадраў. Праверачныя сходы прайшлі пры шырокім удзеле беспартыйных рабочых і работніц і радавых партыйных мас. Аб узрастаючай актыўнасьці і палітычнай сьвядомасьці мас сьведчыць той факт, што за ўвесь час праверкі кіраўнічых кадраў было толькі два выступленьні, якія грунтаваліся на асабістай глебе. Усе іншыя выступленьні былі прасякнуты дзелавой самакрытыкай і крытыкай і імкненьнем дапамагчы камісіі ЦКК УсеКП(б) выявіць сапраўднае становішча кіраўнічых кадраў Беларусі.

Вынікі чысткі кіраўнічых кадраў маюць рашаючае і пераломнае значэньне для ўсёй КП(б)Б. Гэтыя вынікі высунулі перад КП(б)Б- адказную палітычную задачу вылучэньня новых пралетарскіх кадраў партыі на кіраўнічыя партыйныя пасты. У асноўным кіраўнічы склад КП(б)Б зьяўляецца бальшавіцкім, загартаваным калектывам, які цалкам забясьпечвае сваім кіраўніцтвам правільнае і цьвёрдае правядзеньне генэральнай лініі партыі. Але асобныя таварышы ня здолелі апраўдаць давер'е партыйных мас і бязумоўна ня могуць быць на кіраўнічай партыйнай рабоце.

Так, супроць члена ЦК КП(б)Б работніцы фабрыкі «Дзьвіна» Станкевіч былі высунуты сур'ёзныя абвінавачаньні ў розных антыпартыйных учынках аж да шкодніцтва на фабрцы. Гэты выключны факт тлумачыцца тым, што ў КП(б)Б у асобных арганізацыях мела месца выпадковае вылучэньне на кіраўнічую работу. Некаторыя мясцовыя арганізацыі фармальна адносіліся да вылучэньня новых кадраў і ў выніку на кіраўнічыя пасты былі высунуты асобныя таварышы, якія зусім не карыстаюцца ніякім аўтарытэтам сярод радавых камуністых і беспартыйных рабочых мас.

Праверка паказала таксама, што частка кіраўнічых кадраў ня ўзброена тэорыяй марксызму-ленінізму, слаба разьбіраецца ў важнейшых тэарытычных і палітычных пытаньнях і ў асобных выпадках праяўляе поўнае няведаньне гэтых пытаньняў, якое мяжуецца з палітычнай няпісьменнасьцю. Напрыклад, адзін таварыш (кандыдат у члены ЦК) ня мог адказаць на праверачным сходзе, што такое індустрыялізацыя і чаму наша партыя называецца камуністычнай. Другі таварыш на пытаньне аб барацьбе з правым ухілам ва ўмовах Беларусі даў палітычна няправільны адказ, што ў Беларусі няма глебы для правага ўхілу.

Усе гэтыя факты падкрэсьліваюць патрэбнасьць узмацненьня тэарытычнага ўзроўню кіраўнічага складу і выпучэньня новых кіраўнічых кадраў з лепшай часткі пралетарскага ядра КП(б)Б. Выключнае палітычнае значэньне гэтай задачы для КП(б)Б адзначылі як камісія ЦКК УсеКП(б), так і бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК КП(б)Б.

Арганізацыйныя вынікі чысткі лішні раз пацьвярджаюць, што кіраўнічыя кадры КП(б)Б у сваёй асноўнай масе зьяўляюцца бяздольнымі і могуць правільна ажыцьцяўляць партыйна-палітычнае кіраўніцтва.

Камісія ЦКК УсеКП(б) калажыла розныя партыйныя спагнаньні толькі на 5 проц. кіраўнічага складу. З гэтага ліку два таварышы выведзены са складу ЦК і ЦКК.

Скажэньні ў падрыхтоўцы

Адразу пасьля чысткі кіраўнічага складу началася праверка вясковых і вайсковых арганізацый КП(б)Б. Трэба адзначыць, што пры агульнай здавальняючай падрыхтоўцы некаторыя раённыя арганізацыі вельмі дрэнна падрыхтаваліся да чысткі. Асобныя раённыя камітэты партыі склалі няправільныя характарыстыкі на ячэйкі, якія (характарыстыкі) змазвалі недахопы і скажэньні і зусім не адпавядалі сапраўднасьці. Акрамя гэтага некаторыя райкомы і ў прыватнасьці сакратары РК імкнуліся ўнікнуць удзелу ў рабоце праверкомаў, апраўдваючыся сваясасаблівай тэорыяй аб тым, што: «чыстка—справа кантрольных камісій».

ЦКК сваячасова ўдарыла па гэтых недахопах і заклікала партыйныя арганізацыі дапамагчы праверкомам у іх рабоце.

Склад праверкомаў быў скансструяваны ў поўнай адпаведнасьці з інструкцыяй ЦКК УсеКП(б). Рабочыя ў складзе праверкомаў займаюць дамінуючае месца (83,4 проц.). 39 проц. членаў праверкомаў маюць дарэвалюцыйны партыйны стаж.

Актыўнасьць мас

Чыстка вясковых ячэек праходзіла пры найшырэйшым і актыўнейшым удзеле батрацтва і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі.

У сярэднім на кожным сходзе на чыстцы прымала ўдзел да 200 чалавек, што зьяўляецца, бясспрэчна, вялізарным дасягненьнем. У часе чысткі беднята і серадняцтва адзіным фронтам выступілі супроць падкулачнікаў і заможнай часткі вёскі, якія імкнулся дыскрэдытаваць лепшых членаў партыі і скарыстаць чыстку ў сваіх інтарэсах. Можна падаць дзесяткі і сотні прыкладаў гэтай вялікай актыўнасьці асноўных мас сялянства. Ва многіх раённых арганізацыях Беларусі сходы па чыстцы пачыналіся з 7-8 гадзін вечара і працягваліся да самай раніцы. Усе спробы праверкомаў зрабіць перапынак, каб даць магчымасьць адпачыць прысутным, канчаліся няўдала. Батракі, с.-г. рабочыя, беднята і сераднякі проста з работы прыходзілі на сходы і літаральна прасілі праверкомы працягваць сходы без перапынку.

Ідэёва і клясава чужыя элемэнты выключаны з партыі

Пры бліжэйшай дапамозе мас камісіі вывялі сапраўднае становішча вясковых арганізацый і выкрылі тых камуністых, што зусім не апраўдалі сябе, як члены і кандыдаты партыі. У часе чысткі быў адначаны рад фактаў, калі вясковыя партыйцы імкнуліся замазаць хваравітыя зьявы і ўвесьці ў зман праверкомы. У такіх выпадках ініцыятыўная роля ў разгортваньні самакрытыкі цалкам пераходзіла да вясковай беднаты, якая шчыра дапамагала камісіям рашуча выкрыць усе памылкі, недахопы і скажэньні.

Чыстка вясковых ячэек КП(б)Б паказала, што асобныя арганізацыі засьмечаны клясава-чужым элемэнтам і не праводзілі на некаторых вучастках работы выразнай партыйнай лініі.

У асобных зьвяньнях вясковых арганізацый мелі месца факты праваапартуністычнай дзейнасьці, прымірэнцтва, скажэньня клясавай лініі і бытавога разлажэньня. У выніку чысткі выявілася, што ў складзе вясковых арганізацый быў значны процант кулакоў. У вясковых арганізацыях КП(б)Б кулакі складалі 1,52 проц. Па асобных акругах гэта лічба значна вышэйшая (у Віцебскай арганізацыі—4 проц.). Ва многія ячэйкі пралезьлі чужыя шкодныя элемэнты. У Менскай акрузе, напрыклад, аднэй ячэйкай кіравалі белагвардзейцы—былыя калчакоўскія афіцэры. Другая ячэйка прыняла ў партыю былога бандыта, які актыўна змагаўся супроць Савецкай улады. Сярэдні процант выключэньняў па вясковых арганізацыях складае 14,2 проц. Большасьць выключаных—непралетарскія і заможна-кулацкія элемэнты. 13,9 проц. атрымалі розныя партыйныя спагнаньні.

Чыстка дапамагла вясковым арганізацыям выжынуць са сваіх радоў ідэёва і клясава чужыя элемэнты і падняць сваю клясавую баяздольнасьць для таго, каб яшчэ з большай рашучасьцю і настойлівасьцю праводзіць у жыцьцё задачы партыі па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і разгортваньні наступленьня на капіталістычныя элемэнты.

Узмацніць тэмп вярбоўкі

Трэба адзначыць, што вясковыя арганізацыі невыстарчальна выканалі важнейшую задачу чысткі—увязаць чыстку партыі з вярбоўкай новых кадраў батракоў, с.-г. рабочых і лепшых калгасьнікаў і беднякоў-актывістых.

На гэтым фронце вясковыя арганізацыі не дасягнулі поўных вынікаў. І таму кожная вясковая парт'ячэйка павінна максымальна ўзмацніць сваю работу на вярбоўцы новых кадраў. Аб тым, што для росту ёсьць вялізныя, нявычэрпныя рэзэрвы, сьведчаць хаця-б наступныя лічбы. У Мазырскай акрузе на 5.000 батракоў і с.-г. рабочых налічваецца толькі 77 камуністых.

Памылкі ў практыцы праверкомаў

Падагульваючы вынікі работы праверкомаў, можна сьмела адзначыць, што праверачныя камісіі з пастаўленымі перад імі палітычнымі задачамі справіліся. Аднак, у радзе месц асобныя праверкомы дапусьцілі грубыя скажэньні і памылкі. Пры чыстцы асобныя праверкомы дапускалі павярхоўны і экзаменацыйны падыход. Камуністаму-беднаку задаваліся пытаньні на складаныя палітычныя тэмы. Частка праверкомаў ня імкнулася вывяць сапраўднае становішча ўсёй партыйнай работы, абмежавалася тым, што праверыла членаў арганізацыі. У выніку такога павярхоўнага і фармальнага падыходу былі выпадкі, калі акруговыя КК і ЦКК скасоўвалі пастановы такіх праверкомаў. Так, Полацкая АКК скасавала пастановы праверкому па чыстцы дзьвёх ячэек. Праверачная камісія ня выкрыла ўсіх тых злачынстваў, якія рабіліся ў гэтых ячэйках, і таму Полацкая КК прымушана была вызначыць паўторную чыстку гэтых ячэек. Такі-ж факт меў месца ў Коханаўскай раённай арганізацыі (Аршанская акруга). Камісія па праверцы гэтай арганізацыі правяла чыстку павярхоўна і ня выявіла ўсіх недахопаў і скажэньняў. ЦКК скасавала пастанову праверкому і прапанавала правесьці паўторную чыстку Коханаўскай арганізацыі.

Чыстка ўзьняла клясавую баяздольнасьць партарганізацый

Аналізуючы агульныя вынікі чысткі, можна з упэўненасьцю сказаць, што праверка і чыстка кіраўнічых кадраў і вясковых арганізацый КП(б)Б прайшла ў поўнай адпаведнасьці з інструкцыяй ЦКК УсеКП(б). Чыстка, вызваліўшы КП(б)Б ад выпадковых і чужых элемэнтаў, узмацніла партыйныя арганізацыі, зрабіла іх яшчэ больш баяздольнымі і маналітнымі ў барацьбе за генэральную лінію партыі, яшчэ больш непрымірымымі да ўхілу ў правым апартунізмам, прымірэнцтвам і «левымі» загібамі.

На хаду выправіць хібы

З такімі палітычнымі вынікамі мы прыступілі да чысткі савецкіх ячэек. Гэтыя вынікі зьяўляюцца зарукай таго, што ў КП(б)Б чыстка савецкіх ячэек КП(б)Б трэба сваячасова сьгналізаваць аб хібах у гэтай рабоце і выпраўляць іх. У практыцы асобных праверкомаў (Віцебск, Менск) былі выпадкі, калі праверачныя сходы зрываліся і чыстка праходзіла бяз удзелу мас. Гэта сьведчыць аб тым, што асобныя савецкія парт'ячэйкі слаба падрыхтаваліся да чысткі. Наша задача заключаецца ў тым, каб на хаду выправіць гэтыя хібы і правесьці чыстку савецкіх ячэек пры самым шырокім удзеле мас і разгорнутай бальшавіцкай самакрытыцы, ня гледзячы на асобы.

Усім АК і РК КП(б)Б.

Завочные курсы па павышэньні тэарытычнай кваліфікацыі партактыву пры камуністычным унівэрсытэце імя Ў. І. Леніна паведамляюць, што 23 кастрычніка г. г. курсамі разасланы па ўсіх АК і РК КП(б)Б асобныя карткі і матар'ялы для ўсіх т. т., што паступаюць на курсы.

АК і РК павінны пасьпрыць укамплектаваньне курсаў.

Завочныя курсы партактыву пры КУБ імя Ў. І. Леніна.

ПЕРАД СУДОМ МАС

(Ячэйка КП(б)Б с.-г. тэхнікуму, Барысаў)

Ячэйка с.-г. тэхнікуму правяла вялікую падрыхтоўчую работу да чысткі партыі. У выніку належнай падрыхтоўкі ў чыстцы ячэйкі бралі ўдзел беспартыйныя рабочыя, сяляне, вучнёўства і настаўнікі. На кожным праверачным сходзе ў сярэднім прысутнічала капа 300 чалавек.

Чыстка паказала, што ячэйка ў асноўным зьяўляецца здаровай і ідэалёгічна вытрыманай. Ячэйка зьвязана з вёскай, праводзіць штодзённую і сыстэматычную работу сярод беднаты і серадняцтва і карыстаецца вялікім аўтарытэтам на вёсцы. Члены ячэйкі сваячасова ўзьнялі пытаньне аб барацьбе з чужымі элемэнтамі, якія пралезьлі ў тэхнікум. За апошні час з тэхнікуму выключана 9 чалавек. Вялася барацьба і з ідэалёгічнымі скажэньнямі ў выкладаньні навуковых дысцыплін з боку выкладчыкаў, якія настроены супроць марксызму. Ячэйка рашуча змагалася з права-апартуністычнай ідэалёгіяй, якая прапагандавалася ў некаторых навуковых падручніках. Бібліятэка тэхнікуму была засьмечана кніжкамі розных буржуазных ідэолёгаў. Бюро дабілася ачышчэньня бібліятэкі ад гэтага хламу.

Але побач са станоўчымі момантамі ў практыцы ячэйкі ёсьць недахваты і хібы. Адным з іх зьяўляецца тое, што ячэйка зусім слаба расьце за лік навукольных с.-г. рабочых, батракоў і актывістых-беднякоў. Трэба адзначыць, што асобныя члены ячэйкі прымірэнча адносяцца да чужых і ідэалёгічных шкодных элемэнтаў, што вычышчаны з тэхнікуму. Праверачная камісія павінна ўлічыць гэты факт і дасканала праверыць гэтых партыйцаў.

Бандаровіч.

Прымірэнцтва на практыцы

(Ячэйка КП(б)Б НКФ БССР)

Нельга сказаць, каб партыйная ячэйка НКФ БССР зусім не рыхтавалася да чысткі партыі. Былі даклады, прымаліся рэзалюцыі, зацьвярджаліся пратаколы і г. д.—усё тое, чым фармальна апраўдваюцца пры слабой падрыхтоўчай рабоце. Але факты—упартая рэч. Першыя тры вечары праверкі і чысткі ячэйкі паказалі, чаго варты адны рэзалюцыі і пратаколы без практычнай канкрэтнай работы. Ячэйка зусім не падрыхтавалася да чысткі і не прыцягнула беспартыйных рабочых і работніц да ўдзелу ў праверцы. У выніку на праверачных сходах прысутнічаюць толькі 5-8 рабочых з прымаданых заводаў «Энэргія» і «Чырвоная Зара». Калі яшчэ дадаць да гэтага факту, што рабочыя літаральна не бяруць удзелу ў самой праверцы, дык якасьць падрыхтоўчай работы стане яшчэ больш яснай.

Спрэчкі па дакладу сакратара паказалі, што ў ячэйцы ёсьць рад буйнейшых недахопаў і скажэньняў, якія мяжуюцца з прымірэнцтвам да канкрэтных праяў правага апартунізму. Ячэйка зусім не рэагавала на правую практыку асобных акрфа. Скажэньне клясавай лініі ў фінансавых органах ня сустрэла адпору і рэагаваньня з боку асобных адказных працаўнікоў НКФ. Наадварот, асобныя працаўнікі яўна прымірэнча адносіліся да правых скажэньняў у практыцы акрфа. Вось характэрны факт. Інспэктарам падатковага кіраўніцтва НКФ былі выкрыты скажэньні клясавай лініі практыкі Гомельскага акрфа. Інспэктар паведаміў аб гэтым начальніка падатковага кіраўніцтва НКФ партыйца Кардашэнка.

Але, як рэагуе на гэты факт тав. Кардашэнка?

Ён «прапрацоўвае» належным чынам акт рэвізіі і замазвае справу. Ніякіх вынікаў рэвізіяў Гомельскага акрфа тады так і не дала. Таксама ячэйка не рэагавала на тое, што Наркамфін абараняў інтарэсы спэкулянта Лапірава.

Ячэйка не змагалася з разлажэньнем у апаратах фінансавых органаў, ня ўзьнімала пытаньня аб ачышчэньні іх ад чужых антысавецкіх элемэнтаў і літаральна нічога не зрабіла па арабочаньні апарату.

Партдысцыпліна ў ячэйцы не адчувалася. У практыцы ячэйкі былі выпадкі, калі партыйцы адмаўляліся ад даручэньняў бюро паехаць на работу ў вёску.

За першыя тры вечары праверку прайшлі 6 таварышоў. У часе праверкі высьвятляецца, што большасьць членаў ячэйкі палітычна не падрыхтавана, што ячэйка сваячасова не завастрыла ўвагі на палітычных памылках і шкодных зьявішчах, якія мелі месца ў практыцы НКФ.

З. Н.

ЦІ НЕ ПАМЫЛІУСЯ ПРАВЕРКОМ?

На працягу тыдню праверком выяўляе недахопы ячэйкі нархарч (Менск) яе асобных членаў. Высьветліўся рад адмоўных зьявішч як у кіраўніцтве ячэйкі, так і ў паводзінах асобных членаў партыі. Так ячэйка, прызваная абслугоўваць тысячы хатніх работніц, прышоўшых у горад з вёскі, не наладзіла ліквідацыі няпісьменнасьці, зусім адсутнічала шэфработа, ячэйка слаба кіравала гаспадарчай працай, не сачыла за выкананьнем саўдагавору, ня цікавілася працай камсамолу і добраахвотных таварыстваў, мелі месца п'янства, склокі і хістаньні паасобных членаў партыі.

У ячэйцы ёсьць такія члены партыі, як былы калчаковец, падрабляўшы дакументы, Гансецкі, служыўшы чэхам і Калчаку—Вялікаселец, пералётная сарока Нікіцін, абышоўшы за апошнія пару год каля 8 устаноў, адкуль парторгапы яго гналі за сыстэматычнае скрыўленьне лініі. «Уходили» Нікіціна, па яго словах, кожны раз са «строгім папярэджаньнем», або бяз «строгага», але з вымовай. Быў выяўлен факт разлажэньня верхавіны. Так, старшыня ЦП саюзу Чаркаскі, паказаўшы сябе малапісьменным у палітычных пытаньнях, на запытаньне, чаму ён не наведваў політгуртка, адказвае, што вельмі заняты, перагружаны, зусім мала бывае дома. Камісія здолела высьветліць гэтую перагрузку і аказалася, што тав. Чаркаскі сапраўды заняты ў кампаніі кухараў за чаркай, за картамі «в рамса по пятачку» і г. д.

Здавалася-б, што заключэньне камісіі моцна стукне па шкурніках, што прымазаліся, разлажыліся і г. д. Але невядома, чаму праверком увесь цяжар накіраваў на работніцу Гаўштэйн, пастанавіўшы выключыць яе з партыі за палітнапісьменнасьць і... за пагадку на курорт, прычым выключаная нават ня была выклікана ў камісію для тлумачэньня прычын курортных «разьездаў»

Некаторыя таварышы партыйцы і камсамольцы выступілі ў абарону т. Гаўштэйн, паказваючы, што яна палітычна малапісьменная, дзякуючы агульнай няпісьменнасьці і сваёй доўгай хваробе. Ня гледзячы на хваробу, добра працавала ў камсамольскай ячэйцы па сутаварыстве з Чырвонай арміяй, ня мела ніводнага спагнаньня, або заначэньня з боку бюро парт'ячэйкі, выконвала ўсе даручэньні бюро. Паўстае пытаньне, ці не памылілася камісія. Зразумела, што няправільна ўзяты прыцэл б'е міма і зьяўляецца шкодным асабліва ў такой справе, як чыстка радоў нашай партыі.

Адпаведным кантрольным органам ды і самому праверкому трэба ўважліва прадумаць вынесеную пастанову.

А.

Забыліся аб вярбоўцы

Скончана чыстка ячэйкі КП(б)Б машынна - дарожнага атраду Белдартрансу (Барысаў). На праверачных сходах прысутнічала шмат беспартыйных рабочых атрадаў. Праверка выявіла, што ў ячэйцы ёсьць вялікія недахопы. Ячэйка зусім не займалася палітычнай асьветай сваіх членаў. Пастановы 16-й партканфэрэнцыі, лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б) і XII-га зьезду КП(б)Б ячэйкай не прапрацаваны. Палітычны ўзровень членаў ячэйкі зусім нізкі.

У сваёй штодзённай рабоце ячэйка літаральна ня цікавілася пытаньнямі росту, ня гледзячы на тое, што база для вярбоўкі ёсьць. У атрадзе працуе некалькі дзесяткаў рабочых, сярод якіх ёсьць таварышы, што могуць і павінны быць у партыі. Пры атрадзе было 6 камсамольцаў, парт'ячэйка не зьвярнула на іх ніякае ўвагі і ў выніку яны адаравіліся ад камсамольскага жыцьця і мэханічна выбылі з камсамолу. Сярод жанчын не вялося ніякай работы.

Самакрытыка ў атрадзе слаба разгорнута. Аб гэтым сьведчыць тое, што ў спрэчках партыйцы выказваліся выключна па дадатніх бакох работы ячэйкі

З усіх праверваных таварышоў ні адзін партыец ня выключаны з партыі. Адзін член ячэйкі атрымаў вымову за пасьпяшанасьць.

Б. Г.

Па БССР



Работа землячарпалкі на радэ Арэсе (Марчінскі масіў)

Дэлегаткі арганізавалі чырвоны абоз

ПУХАВІЧЫ. (Наш кар.). Дэлегаткі вёскі Блонь, Пухавіцкага раёну, у зьвязку з перавыбарамі дэлегатак арганізавалі чырвоны абоз з бульбай. Яны звезлі 500 пуд. бульбы замест вызначанай сельсавету кантрольнай лічбы, якая ўжо выканана.

Вольныя памяшканьні — пад склады збожжа

ВОРША. (Наш кар.). Аршанская акруговае праўленьне саюзу савецкіх гандлёвых служачых арганізавала брыгаду, якая занялася выяўленьнем памяшканьняў, годных пад склады для збожжа і бульбы. Брыгада ўжо скончыла сваю работу і выявіла рад памяшканьняў пад склады. Зараз усе памяшканьні ўзяты на вучот і будуць скарыстаны загатоўшчыкамі.

Рынак гароднінны ў руках прыватніка

ПОЛАЦАК. (Наш кар.). Загатоўка гароднінны і садавіны павінна зараз зьяўляцца аднэй з важнейшых задач нашай каапэрацыі: трэба выбіць прыватніка з гэтага рынку, на якім ён даўно туль моцна трымаецца.

Полацкія каапэрацыйныя арганізацыі нічога не зрабілі, каб заваяваць рынак гароднінны; яны не падрыхтаваліся да асеньняга загатоўчага сэзону. Спажывецкі саюз лічыў, што гэта справа сельсаюзу, а сельсаюз таксама чакаў ля мора пагоды. Выйшла так, што на рынку стаў гаспадарыць прыватнік Галеркін.

У калгасах капуста гніе, няма збыту, а ў Галеркіна ЦРК і сельсаюз адкупілі цалкам увесь ураджай капусты, ды яшчэ далі яе яму на закваску на кабальных умовах.

ДОК.

31 новы калгас

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Паводле апошніх даных, у 6 раёнах акругі ў дзень ураджаю і калектывізацыі арганізаваны новыя 31 калгас на плошчы больш 11 тысяч гэктараў. Узбуйнена 18 калгасаў.

Арганізацыя гароднім гаспадарак

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). ЦРК арганізуе ў ваколіцы гораду вялікую гароднюю гаспадарку на 200 гэктараў. Намячаецца арганізаваць рад гародніх гаспадарак у бліжэйшых саўгасах і калгасах.

160 тысяч руб. запазычанасьці па с.-г. крыдыце

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). За вясковым насельніцтвам акругі налічваецца 160 тысяч рублёў пратэрмінаваных с.-г. пазык. Найбольшая запазычанасьць па пазычках — у Гомельскім і Рэчыцкім раёнах. Сярод неплацельшчыкаў ёсьць злосныя, якія ня выплачваюць пазычак на працягу некалькіх год. Запазычанасьць Гомельскаму крэдытнаму таварыству перавышае 14 тысяч рублёў. Крэдытныя таварыствы нічога ня робяць, каб спагнаць запазычанасьць.

Збор мяшкоў

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Пачаўся збор мяшкоў, які праводзіцца пры дапамозе жактаў, камсамольцаў, членаў гарсавету. У бліжэйшыя дні наладжваецца абход паасобных двароў.

ДА ПЛЕНУМУ ЦЭНТРАЛЬНАГА САВЕТУ АСОАВІЯХІМУ

Сёньня адкрываецца чарговы пленум Цэнтральнага Савету Асоавіяхіму БССР. На парадку дня пленуму ставяцца выключна практычныя пытаньні работы таварыства.

Ня гледзячы на вялікія недахваты ў нашай рабоце, ня гледзячы на нашае, часамі цяжкое, грашовае становішча па ўсіх зьвеньнях таварыства і рад іншых аб'ектыўных недахватаў, беларуская арганізацыя Асоавіяхіму ўсё-ж мае ўжо цэлы рад дасягненьняў у сваёй практычнай рабоце і, бясспрэчна, што арганізацыя расьце як колькасна, так і якасна.

Якія-ж пытаньні трэба абгаварыць пленуму і якое ёсьць становішча па гэтых галінах работы?

ПЛЯНАВАСЬЦЬ У РАБОЦЕ

Тут слабая работа таварыства ў мінулым. Нельга сказаць, што пляны не складаліся. Яны складаліся, але былі настолькі вялізарныя і так часта ня ўлічвалі магчымасьцяй і сіл арганізацыі, што ў большасьці заставаліся ня выкананымі. Праўда, выкананьне асноўных пытаньняў пляну мы маем.

Пленуму трэба будзе сказаць, што арганізацыі павінны ўжыць усе меры, каб выканаць па пляне ўсё намечанае, а тое, што аказалася не пасілах, выкрасьліць зусім.

БЮДЖЭТ

Канстатуючы значнае паляпшэньне бюджэту за мінулы год (перавышэньне першапачатковай сумы на 65 проц.), у вязку з узрослымі задачамі пленуму, трэба будзе намеціць рад канкрэтных мер да максымальнага павялічэньня бюджэту на 1929-30 год. Прэзыдыум гэтае павялічэньне намеціў больш, чым на 300 проц. Такое павялічэньне трэба замацаваць рэальнымі артыкуламі прыбытку.

У нас да гэтага часу былі асноўнымі крыніцамі прыбытку: членскія ўзносы, крыніцамі прыбытку: членскія ўзносы, крыніцамі прыбытку: членскія ўзносы,

Супраць нацыянал-дэмакратызму няма месца ў радах КП(б)Б

Рэзалюцыя сходу ячэйкі КП(б)Б Белдзяржвыдавецтва, ад 31 кастрычніка—29 г.

Выслухаўшы інфармацыю аб новай з'явленай вылазцы беларускіх нацыянал-дэмакратаў, агульны адчынены сход ячэйкі КП(б)Б Белдзяржвыдавецтва і рэдакцый газет пастанаўляе:

1) Апошнюю арганізаванае выступленне «партыйных» і беспартыйных нацыянал-дэмакратаў у часе чыстки тав. Жылуновіча на сходзе ячэйкі працасьветы, зьяўляецца адным з зьвенняў барацьбы беларускага нацыянал-дэмакратызму супроць савецкае улады, камуністычнае партыі і яе ленінскай нацыянальнай палітыкі. Гэтыя вылазкі цесна зьвязаны з антысавецкімі выступленьнямі беларускіх нацыянал-фашыстых Луцкевіча, Астроўскага і другіх лёкаяў польскага фашызму, якія зьяўляюцца праваднікамі ваенных плянаў Пілсудзкага.

Сход сьцьвярджае правідловасьць бальшавіцкай ацэнкі гэтага выступленьня нацыянал-дэмакратаў, якая дадзена ў ЦО КП(б)Б «Зьвязьдзе» ад 30-га кастрычніка 1929 г.

2) Сход лічыць, што выступленьне «камуністых» Ільлючонка, Марука, Ів Цьвікевіча сьведчаць аб тым, што яны зьяўляюцца агэнтамі нацыянал-дэмакратаў, абараняюць шкодную антыпартыйную па сутнасьці контрэвалюцыйную лінію, якая зьяўляецца працягам ранейшай контрэвалюцыйнай лініі нац.-дэмакратаў у прыватнасьці часоў тэатральнай дыскусіі, «лісту трох». Гэтая група, апэруючы аргумэнтамі, узятымі з слоўніка польскага фашызму і зах. беларускага нацыянал-фашызму, стаўшы на чале атакі на партыю і яе ленінскі ЦК, сьцерла усе межы паміж сабой і астатнімі нацыянал-дэмакратамі і таму яна сябе паставіла пазамежамі партыі.

3) Сход лічыць далейшае прабываньне ў партыі гэтай групы немагчымым.

4) Кандыдат партыі Ів. Цьвікевіч, член нашай ячэйкі, які першым выступіў на сходзе ячэйкі працасьветы з заявай аб тым, што быццам чыстка зьяўляецца паказальным працэсам над Жылуновічам і ў сваёй прамове асабліва яскрава разьвіваў нац.-дэмакратычную ідэалёгію, гэтым самым паказаў свой клясава-варожы твар. Лічачы, што выступленьне Цьвікевіча на сходзе ячэйкі працасьветы зьяўляецца невыпадковым зьявішчам, а вынікае з нац.-дэмакратычных перакананьняў (абарона ў свой час шкодных прамовы Юргілевіча), сход пастанаўляе: выключыць Цьвікевіча Івана з шэрагаў партыі і патрабуе ад праўленьня БДВ зьняць яго і Марука з працы ў апараце БДВ.

5) Ячэйка БДВ завярае ЦК партыі ў тым, што яна будзе змагацца за ачышчэньне ячэйкі БДВ ад яўных і скрытых нацыянал-дэмакратаў і будзе дапамагаць усёй партыі у барацьбе з усімі праявамі нацыяналізму і шавінізму і асабліва з найбольш небясьпечным у сучасны пэрыяд беларускім нацыянал-дэмакратызмам.

6) Сход адначае няправільную ацэнку дадзеную у газэце **«Рабочий»** (№ 250 ад 31-га кастрычніка 1929 г.) выступленьня Цьвікевіча, характарызуючы гэта выступленьне толькі як прыміранцкае.

Адказных работнікаў на нізавую работу

Лістападаўскі пленум ЦК УсеКП(б) у сваіх пастановах прызнаў неабходным пасылку адказных работнікаў на нізавую работу, да варштату і ў вёску.

«Неабходна,—гаворыцца ў пастанове пленуму ЦК,—каб кіруючы партыйны кадр значна ўзмацніў сваю сувязь з масамі шляхам удзелу ў рабочых сходах, справаздачнасьці перад рабочымі і сялянамі аб сваёй рабоце (партыйнай, савецкай, прафсаюзнай, каапэрацыйнай, гаспадарчай), выездаў на месцы для практычнага кіраўніцтва нізавымі органамі, пераходам з кіруючых пастоў на доўгую работу на вытворчасьць і ў нізавых арганізацыях і ўзмоцненым высоўваньнем новых кадраў рабочых з вытворчасьці на кіруючую работу ва ўсіх органах».

Гэта дырэктыва пленуму ЦК на месцах праводзіцца вельмі слаба або зусім абходзіцца. Досыць сказаць, што такая буйная арганізацыя, як Ленінградская, вдолела пасласць на нізавую работу толькі 12 чалавек і то гэтай справы не давяла да канца.

Некаторымі арганізацыямі дырэктыва праводзіцца вельмі аднабакова. У нізы пасылаюцца толькі работнікі, якія праштрафіліся (Баку, Ленінград), або вылучэнцы, якія варочаюцца да варштату, не апраўдаўшы давер'я і якія аказаліся няпрыгоднымі на кіруючую работу.

Бязумоўна, такая пасылка неабходна і як мера барацьбы з бюракратызмам, адрывам ад мас, але трэба памятаць, што пасылка ў нізы работнікаў, якія праштрафіліся і не апраўдалі давер'я партыі, толькі другарадная, а не галоўная задача.

Якую задачу меў на мэце лістападаўскі пленум ЦК. даючы дырэктыву?

Напершае,—узмацненьне партыйнага кіраўніцтва нізавых арганізацый, іх перабудову ў адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага перыяду і ўзмацненьне сувязі партыі з беспартыйнымі масамі.

Падругое, як меру барацьбы з адрывам адказных работнікаў ад мас, з бюракратызмам і з «бытавым загніваньнем».

Выкананьне гэтай дырэктывы бязумоўна ня простае. Тым з большай энэргіяй патрэбна ўзяцца за яе ажыцьцяўленьне.

Перш за ўсё арганізацыі павінны будуць адмовіцца ад палажэньня «незаменнасьці» работнікаў і ад боязьні магчымасьцяй «зрыву» работы «ўверсе».

Тав. Ленін ня раз выступаў супроць «незаменнасьці» адказных работнікаў і ня раз выказваўся за ажыцьцяўленьне «зьменнасьці ў любы час».

Правядзеньне гэтай работы патрабуе **самых сур'ёзных адносін і найбольшай плянамернасьці.** Трэба строга ўлічваць куды каго пасласць. Трэба больш лічыцца не з жаданьнем пасыланага, а з неабходнасьцю ўзмацненьня найбольш важных вучастка́ў (буйныя прадпрыемствы, калгасныя раёны).

Работнікаў-жа больш дробнага маштабу (раённага) больш мэтазгодна пасылаць у тыя прадпрыемствы і арганізацыі, адкуль яны былі высунуты на кіруючую работу.

Другая задача—гэта праверка выкананьня пастаноў аб пасылцы і пасганяннай сувязі з пасланымі. Практыка паказала ўжо, наколькі гэта важна. Напрыклад, многія з пасланых Ленінградскай арганізацыяй «не дайшлі да варштатаў» (адны паехалі ў адпачынак, другія пайшлі на вучобу, трэція не падыйшлі шчыльна да працы).

Вопыт Маскоўскай арганізацыі, якая паслала на нізавую работу 109 адказных таварышоў, красамоўна гаворыць за посьпех гэтай работы. Работнікі аказаліся для цэнтру «заменнымі». На вытворчасьці яны заваявалі аўтарытэт ня толькі сярод партыйцаў, але і сярод беспартыйных. Яны аказаліся ў ролі сапраўдных кіраўнікоў нізавых арганізацый. З прыходам іх на вытворчасьць, больш інтэнсыўным тэмпам пайшло выяўленьне нізавога актыву і высоўваньне яго на адказную работу.

Сьледам за Масквой трэба разгарнуць поўным тэмпам гэту работу ва ўсіх арганізацыях.

РАЗВУШКІН.

Працягваем абмяркоўваць новы зямельны кодэкс

ЯК НОВЫ КОДЭКС ВЫРАШАЕ ПЫТАНЬНІ ЗЕМЛЯЎПАРАДКАВАНЬНЯ*)

Новы Зямельны Кодэкс БССР, які разасланы зараз на абмеркаваньне шырокіх колаў працоўных, уносіць цэлы рад зьмен у асноўныя палажэньні зямлеўпарадкаваньня, існаваўшыя ў старым Зямельным Кодэксе.

Арт. 292 праекту кодэксу дае **грунтоўную палітычную ўстаноўку ролі зямлеўпарадкаваньня ў справе перабудовы с.-гаспадаркі. «Зямлеўпарадкаваньне зьяўляецца аграрна-палітычным мерапрыемствам дыктатуры пралетарыяту, яно павінна праз правільную арганізацыю тэрыторыі стварыць умовы, якія дапамагаюць вышыраньню сацыялістычных форм зямлякарыстаньня і гаспадаркі, а таксама ўздыму вытворчых сіл бяднякоў-серадняцкіх гаспадарак, іх каапэраванью і калектывізацыі.**

Да мінулага 1928 г., як правіла, зямлеўпарадкаваньне залежала ня столькі ад гаспадарчых меркаваньняў, колькі выплаты насельніцтвам грошай за яго правядзеньне.

Таму ў інтарэсах сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі адпаведны артыкул новага зямельнага кодэксу даводзіць, што **зямлеўпарадкаваньне павінна праводзіцца суцэльным спосабам, г. зн. шляхам ахопу раду вялікіх зямельных тэрыторый, на якіх патрэбна правядзеньне адноўкавых мерапрыемстваў па перабудове гаспадарскі.**

Выбарачнае зямлеўпарадкаваньне дазваляецца выключна для дзяржаўных і грамадзкіх патрэб, або ў сувязі з утварэньнем сельска-гаспадарчых калектываў.

Пры зямлеўпарадкаваньні павінны захоўвацца інтарэсы беднаты. Клясавая сутнасьць зямлеўпарадкаваньня яскрава адбіта ў радзе артыкулаў новага Зямельнага Кодэксу. Напрыклад, зямельныя вучасткі, на якіх бяднякі і серадняцкімі гаспадаркамі, зроблены карэнныя паляпшэньні пры правядзеньні зямлеўпарадкаваньня, пакідаюцца пераважна за ранейшымі зямлякарыстальнікамі. Калі-ж гэта немагчыма зрабіць, то ранейшаму зямлякарыстальніку выплачваецца кошт праведзеных работ.

Калектыўным гаспадаркам, а таксама незаможным двароў пры зямлеўпарадкаваньні даюцца пераважна перад другімі працоўнымі зямлякарыстальнікамі землі лепшай якасьці, больш выгодна разьмешчаныя, а таксама забясьпечаныя вадою і дарогамі.

Бяднякам і серадняцкім гаспадаркам даюцца ільготы і крэдыт на аплату зямлеўпарадкаваўчых работ, перабудову і арганізацыю іх гаспадарак і інш.

Тут трэба падкрэсьліць, што раней існаваўшы кодэкс не даваў яскравай устаноўкі ў пытаньні аховы інтарэсаў беднаты пры зямлеўпарадкаваньні.

Таксама праект новага кодэксу выразна дае ўстаноўку на справу зямлеўпарадкаваньня. Дзяржаўны запас, які стварэецца пры зямлеўпарадкаваньні некалькіх сельска-гаспадарчых аб'яднаньняў, павінен адводзіцца ў адным месцы для арганізацыі новых буйных зямлякарыстаньняў. Гэта па сутнасьці забараняе стварэньне няжыцьцёвых хутарскіх гаспадарак пры зямлеўпарадкаваньні.

Формы зямлеўпарадкаваньня

Праект новага кодэксу таксама зусім выразна вырашае гэта вельмі важнае пытаньне.

У першую чаргу праводзіцца зямлеўпарадкаваньне ў мэтах аграмаджаньня зямлякарыстаньня, а таксама для патрэб дзяржаўных устаноў і прадпрыемстваў і грамадзкіх арганізацый, для гарадзкіх паселішч і пасёлкаў, і для асобных катэгорый зямлякарыстальнікаў, прадугледжаных спэцыяльнымі законамі.

Па заяўках рэшты карыстальнікаў пераважа аддаецца ў сэнсе чарговасьці тым, хто пераходзіць да такіх форм зямлякарыстаньня, што найбольш спрыяюць каапэраваньню, калектывізацыі і ўздыму тэхнічнага ўзроўню сельскай гаспадаркі. Заяўкі аб зямлеўпарадкаваньні хутарскіх і адрубных гаспадарак у тых мясцовасьцях, дзе гэта вядзе да росту або замацаваньня кулацтва, пакідаецца без выканаьня.

А як-жа робіцца зямлеўпарадкаваньне для паасобных гаспадарак. На гэта адказвае таксама праект кодэксу наступным чынам:

Зямлеўпарадкаваньне сельскіх паселішч у БССР, як правіла, праводзіцца на месцы, гэта значыць без расьсяленьня, якое занадта дорага каштуе, руйнуе гаспадарку і ня прыносіць выгад.

Зямлеўпарадкаваньне калгасаў

Гэтаму пытаньню праект кодэксу адводзіць значнае месца.

Паводле праекту зямлеўпарадкаваньне калектываў адбываецца ў першую чаргу і пры тым за кошт дзяржавы. Таксама праект вырашае пытаньне аб выхадзе з зямельнай грамады часткі гаспадарак, якія пажадаюць арганізаваць калектыўную гаспадарку.

Адпаведны артыкул даводзіць, што група двароў (ня менш 15-10), якая жадае стварыць калгас, або таварыства на грамадзкай апрацоўцы зямлі, мае права выйсьці з зямлёй на адно месца бяз згоды грамады.

Таксама мае вялікае значэньне адпаведны артыкул праекту, які дазваляе асобным членам двара бяз згоды іншых, правесьці падзел гаспадаркі для таго, каб выйсьці ў калгас і атрымаць належачую долю маемасьці і зямлі.

Гэты артыкул мае вялікае значэньне для ўсёй моладзі нашага вясковага, партыйнага, камсамольскага і беспартыйнага актыву

І, урэшце, для калгасаў пры зямлеўпарадкаваньні адводзяцца землі лепшыя па якасьці і па месцы знаходжаньня, прыстасаваныя для апрацоўкі яе буйнымі с.-г. машынамі і прыладамі.

Нормы зямлякарыстаньня

Стары зямельны кодэкс устанаўляў дзьве нормы—максымальную (ці найбольшую) і мінімальную (ці найменшую).

Такім чынам, па сутнасьці існавалі 2 мінімальныя (ці найменшыя нормы), і для беднякоў, а 2-ая для заможных і кулакоў. Па нашай думцы, існаваньне 2-х норм тармозіць справу разгортваньня калгаснага будаўніцтва. Бядняк або серадняк, які ідзе ў калгас, атрымліваў толькі, як правіла, мінімальную норму ў сваё фактычнае карыстаньне. Праўда, ёсьць закон, які дае магчымасьць павышаць гэту норму для беднякоў і сераднякоў, якія ідуць у калгасы, на 30 проц., але гэта ні да чога ня прыводзіла, бо не хапала зямлі.

Як-жа вырашае гэта пытаньне новы кодэкс?

Адпаведны артыкул кажа наступнае:

Зямлянадзяленьне і зямлеўпарадкаваньне праводзіцца па адзінай норме зямельнага забесьпячэньня. Норма гэта ўстанаўляецца параённа Саветам Народных Камісараў. Праект кодэксу гэтым артыкулам вызначае толькі прынцып адзінай нормы, не дае лічбовых паказаньняў аб яе велічыні.

Памыляюцца тыя таварышы, якія кажуць, што норм зямлякарыстаньня зараз ня трэба вырашаць.

Нормы працоўнага зямлякарыстаньня, якія вызначаюцца пры зямлеўпарадкаваньні, павінны быць прыстасоўны да тых галоўных задач, якія стаяць перад працоўным сялянствам у справе перабудовы сваёй гаспадаркі.

Пад гэтым пунктам погляду і павінна весьціся праца ў напрамку перагляду норм працоўнага зямлякарыстаньня пры зямлеўпарадкаваньні.

Таму нам думаецца, што будзе зусім няправільна, калі мы і надалей будзем надзяляць зямлёю паасобныя гаспадаркі.

Гэта значыла-б на сутнасьці захоўваць і надалей іх індывідуальную сутнасьць.

Гаспадарка ў 4-5 гэктар. сёньня не зьяўляецца выхадам са становішча.

Гэткія карлікавыя гаспадаркі паядаюць увесь свой прыбытак і зусім не рэнтабэльны. Таму нам думаецца, што трэба зямлянадзяленьне паасобных гаспадарак у індывідуальнае карыстаньне зусім спыніць.

Адзіна магчымым для гэтых гаспадарак зьяўляецца толькі аб'яднаньне ў буйную сацыялістычную гаспадарку. Гэта правільна было-б з усіх пунктаў погляду: як правільнага скарыстаньня крэдытаў, так і ўсіх іншых відаў дапамогі беднаце з боку Савецкай улады.

Для гэтых гаспадарак калгас зьяўляецца адзіна магчымай формай зямлякарыстаньня, якая ўзьніме прадукцыйнасьць іх працы і дабрабыт. Таму прынцып адзінай нормы, які высоўваецца праектам новага зямельнага кодэксу, трэба зьмяніць у наступным напрамку:

Зямлякарыстаньне серадняцкіх гаспадарак захаваць у разьмеры іх фактычнага карыстаньня. Гэта норма, зразумела, па розных раёнах павінна быць рознай і яе трэба добра падлічыць, ня толькі для сёньняшняга дня, а і з вучотам нашых пэрспэктыў гаспадарчага будаўніцтва ў кожным паасобным с.-г. раёне.

Зямлякарыстаньне кулака зьнізіць да нормы серадняка.

Увесь запасны фонд, які атрымліваецца ў выніку правядзеньня такіх норм, павінен пайсьці ў калгас на забесьпячэньне зямлёй бядняцка-серадняцкага сялянства, або ў прырэзку да саўгасаў.

Таксама неабходна ўсе землі, якія застаюцца пасьля перасяленьня, перадаваць існуючым або новым калгасам.

Гэта дасьць вялікія плошчы зямлі для павялічэньня нашага сацыялістычнага сэктару і зусім выразна пастаўціць пытаньне перад дробнай гаспадаркай аб адзіным магчымым шляху яе ўздыму праз буйную аб'яднаную калектыўную гаспадарку.

ВАШЧЫЛА-ВІРЫН.

*) Друкуецца ў парадку абгаварэньня.

Статыстычнае абсьледваньне калгасаў

На працягу верасьня—кастрычніка месяцаў на калгасах БССР праводзіліся тры важныя статыстычныя абсьледваньні, так званыя, каньюнктурныя працы: вучот сеткі калгасаў і машынных таварыстваў, вучот вынікаў зімай кампаніі 1929 г. ў калгасах і вучот прадукцыі расьлінаводзтва.

Гэтыя тры мерапрыемствы павінны прыкаваць да сябе ўвагу ўсёй партыйнай і савецкай грамадзкасьці, бо ад выкананьня гэтых каньюнктурных работ залежыць складаньне хлебафуражнага балянсу аграмаджанага сэктару сельскае гаспадаркі, вучот таварнасьці калгасаў, выяўленьне ўдзелу калгасаў у хлебазагатоўках. Гэта работа будзе праводзіцца праз райстатыстыкаў, але яны могуць справіцца з сваімі задачамі толькі пры дапамозе артыйнай і савецкай грамадзкасьці вёскі і ў прыватнасьці — калгаў.

Першы вопыт вучоту сеткі калгасаў і машынных таварыстваў ужо быў праведзены ўлетку гэтага году, было выяўлена становішча калгасаў на 15 красавіка. Атрыманыя даныя сыгралі вялікую ролю, наколькі яны зьявіліся адзінай крыніцаю правільных вестак аб калгасным будаўніцтве, але за час з 15-га красавіка мы маем вялізны рост калгасаў, рад зьмен у іх складзе, ліквідацыю некаторых калгасаў, аб'яднаньне некалькіх у адзін вялікі калгас і г. д. Зразумела, чаму правядзеньне статыстычных работ у калгасах мае зараз важнае значэньне.

Г. А—ў.

Чарговыя задачы работы з беднатой

Дырэктывы XVI партканфэрэнцыі, XII зьезду КП(б)Б і чэрвеньскай пастановы Сакратарыяту ЦК аб узмацненьні работы сярод беднаты некаторымі партарганізацыямі яшчэ практычна не ажыцьцёўлены. Нарады і канфэрэнцыі груп беднаты, якія набліжаюцца, павінны стварыць рашучы пералом у гэтай рабоце і палепшыць якасьць работы партыйнага кіраўніцтва ёю.

У бліжэйшы час будуць усюды праведзены раённыя нарады і акруговыя канфэрэнцыі груп беднаты. Да іх павінна быць прыкавана ўвага ўсёй партыі. Трэба правесьці дакладную падрыхтоўку да гэтых нарад і канфэрэнцый з такім разьлікам, каб не аказалася ніводнай групы беднаты, у якой-бы наперад не пабывалі работнікі райкомаў і акруткомаў. Падрыхтоўка да правядзеньня раённых нарад і акруговых канфарэнцый груп беднаты павінна быць увязана з максымальным узьняцьцем актыўнасьці ня толькі членаў груп беднаты, але ўсёй беднаты і батрацтва і паслужыць узмацненьнем тэмпу да афармленьня цэлага раду новых груп. Павінен быць устаноўлены самы суровы партыйны кантроль над своечасовым правядзеньнем у жыцьцё ўсіх прынятых пастаноў беднаты.

Работа з беднатою кульгае ва многіх адносінах: недастатковая дапамога бядняцкім гаспадаркам з боку савецкіх, гаспадарчых, каапэрацыйных і іншых грамадзкіх арганізацый, асабліва ў частцы калектывізацыі, вытворчага каапэраваньня і крэдытаваньня беднаты. Надавычайна слабое гаспадарчае замацаваньне беднаты і батрацтва ў калгасах, на падставе аграмаджаньня сродкаў вытворчасьці і росту непадзельных там капіталаў. Не ў належнай меры арганізавана і актыўна ўдзельнічае беднота ў правядзеньні гаспадарча-палітычных кампаній як: рэалізацыя пазыкі індустрыялізацыі, збор пратэрмінаваных пазычак, сума якіх дасягае да 1½ мільёнаў рублёў, правядзеньне і збор сродкаў па самаабкладаньні, уцягненьне сялянскіх грашовых укладаў і паянакалянленьне ва ўсе віды каапэрацыі і г. д. Вельмі слаба мабілізавана ўвага і актыўнасьць беднаты і батрацтва на барацьбу з кулацтвам за пасьпяховае правядзеньне хлебазагатовак.

Асноўным недахопам па арганізацыі беднаты і ў працы груп беднаты **трэба прызнаць тое, што работа з беднатой яшчэ і да гэтага часу ў некаторых мясцох не наніравана на ажыцьцяўленьне задач па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, што групы беднаты і слаба садзейнічаюць ажыўленьню работы саветаў, каапэрацыі і КСУ.**

Арганізацыі беднаты існуюць галоўным чынам для асобных кампаній. Шмат якія групы беднаты працуюць ад выпадку да выпадку, бясплянава і бяз сыстэмы. Частыя выпадкі правядзеньня закрытых сходаў груп беднаты і слаба пастаўлена работа на ўпугненьні батракоў. Пастановы беднаты часта не праводзяцца ў жыцьцё.

Тэмп выпраўленьня ўсіх гэтых недахопаў і афармленьня новых груп беднаты, асабліва ў крэдытнай і спэцыяльнай с.-г. каапэрацыі, з боку парт. арганізацый яўна недастатковы. Жывое кіраўніцтва і дапамогу сельячэйкам з боку РК і акруткомаў нельга лічыць здавальняючым.

З прычыны слабасьці работы з беднатой і батрацтвам, часты яшчэ выпадкі скрыўленьня пралетарска-клясавай лініі ў рабоце саветаў, каапэрацыі і асабліва с.-г. крэдытных і малочна-жывёлагадоўчых таварыстваў. Лепшым сродкам забесьпячэньня шырокага батрацка-бядняцкага кантролю над правядзеньнем клясавай лініі ў рабоце саветаў, каапэрацыі, КСУ і інш. грамадзкіх арганізацый зьяўляецца добра наладжаная работа ўнутры гэтых арганізацый моцных, сыстэматычна-плянава працуючых груп беднаты. Вось чаму адной з галоўных форм работы з беднатою (на радзе агульных сходаў, райнарад, акруговых канфэрэнцый груп беднаты) зьяўляецца штодзённая работа груп беднаты. Трэба прыняць усе меры да іх афармленьня, узмацненьня і ажыўленьня.

Групы беднаты павінны быць актыўнымі ўдзельнікамі па наладжаньні і ажыўленьні работы выбарчых органаў, пры якіх групы беднаты існуюць, жорстка сочачы за правядзеньнем прыватэрска-клясавай лініі гэтых арганізацый. Групы беднаты ёсьць не адміністрацыйная арганізацыя і не павінны падмяняць сабою свой выбарчы орган, яны (групы беднаты)—павінны энэргічна і да канца бараніць перад выбарчым органам усе свае пастановы ў інтарэсах батракоў, беднякоў, сераднякоў і рашуча змагацца з кулакам.

Групы беднаты павінны быць не ізаляванай і замкнутай арганізацыяй унутры сваіх выбарчых органаў, а **служыць зброяй згуртаваньня батрацка-бядняцкіх і серадняцкіх мас вёскі** вакол саветаў, каапэрацыі, камітэтаў узаемадапамогі і ўсіх грамадзкіх арганізацый для ажыўленьня іх работы.

Вось чаму, не наладзіўшы правільна, пабальшавіцку работы груп беднаты, нельга думаць і спадзявацца на пасьпяховую арганізацыю паогул работы сярод беднаты і батрацтва і мабілізацыю актыўнасьці шырокіх бядняцка-серадняцкіх мас на справу сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі.

Акруткомы і райкомы павінны заража праверыць практыку работы сельячэек на арганізацыі беднаты, трэба не цыркулярным, а жывым удзелам дапамагаць сельячэйкам і аказаць актыўнае садзейнічаньне ў перабудаваньні мэтадаў работы груп і агульных сходаў беднаты. **У цэнтры ўвагі груп беднаты павінны быць пытаньні: калектывізацыя, вытворчае каапэраваньне, узьняцьце жывёлагадоўлі і кармавая праблема, узьняцьце ўраджайнасьці і правядзеньне аграмінімуму, мерапрыемствы па пасьпяховым правядзеньні гаспадарча-палітычных кампаній.** Павінна быць узмоцнена ўвага груп і сходаў беднаты да культурна-бытавых пытаньняў вёскі —сацыяльнае камплектаваньне школ, ліквідацыя няпісьменнасьці сярод батракоў і беднякоў, распаўсюджаньне кніг і газэт, лепшае абслугоўваньне беднаты і батракоў хатай-чытальняй, бібліятэкай, чырвоным кутком, наладжаньне грамадзкіх лазьняў, дзіцячых ясьляй, пляцовак і г. д.

Адно з важнейшых месц у рабоце груп і сходаў беднаты павінна быць адведзена мабілізацыі ўвагі шырокіх бядняцка-серадняцкіх мас на разгортваньне **сацыялістычнага спаборніцтва ў вёсцы**—як стымулу пасьпяховага выкананьня задач партыі па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі.

У населеных пунктах нацыянальных меншасьцяй, асабліва палякаў, латышоў, літоўцаў у большай меры, чым у беларускай вёсцы, адчуваецца ўплыў з боку кулацтва і клерыкалізму на беднату і сераднякоў. Тут беднота і маламоцныя сераднякі нацменшасьцяй у некаторай сваёй частцы яшчэ да гэтага часу ня ўжылі ўяўленьня аб «нацыянальным адзінстве» і часта перад гэтым уяўленьнем «нацыянальнага адзінства» ў іх затушоўваецца клясавая самасьвядомасьць. Гэта абавязвае нашы партыйныя арганізацыі **ўзмацніць работу з беднатой нацменшасьцяй і арганізаваць групы беднаты там, дзе яны яшчэ ня створаны, забясьпечыўшы парткіраўніцтва імі.**

Накіроўваючы работу па арганізацыі беднаты і батрацтва на задачы сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі і на рашучую барацьбу з кулацтвам, трэба адначасова **зьвярнуць асаблівую ўвагу і на палітычнае выхаваньне беднаты, батрацтва і асабліва членаў груп беднаты.** Тут павінны быць выкарыстаны ўсе магчымасьці—абхон іх сеткаю партвучобы, арганізацыя гурткоў палітграматы, с.-г. гурткоў, гурткоў па вывучэньні пяцігадовага пляну разьвіцьця народнае гаспадаркі СССР і БССР, газэтных гурткоў, прыцягненьне батракоў і беднаты на адкрытыя партсходы і г. д. Кожная парт'ячэйка павінна паставіць сабе задачу—**ніводнага батрака, бедняка—члена групы беднаты не ахопленага адным з відаў палітвучобы, або лікпунктам, калі ён няпісьменны.**

Трэба з усёй рашучасьцю зьвярнуць увагу як цэнтральных (беларускіх), так і акруговых газэт на, бадай, поўную **адсутнасьць асьвятленьня ў друку практыкі месц па арганізацыі беднаты і работы груп беднаты** і патрабаваць найбольш сур'ёзных адносін да гэтага вучастку партыйнай работы.

Раённыя нарады і акруговыя канфэрэнцыі груп беднаты, якія маюць адбыцца, павінны паслужыць рашучым пераломам да ўзьняцьця на больш высокую ступень работы з беднатой і ўзмацненьня якасьці партыйнага кіраўніцтва ёю.

Трэба абвясьціць бязьлітасную барацьбу з недаацэнкай значэньня і важнасьці работы сярод беднаты, як з праяўленьнем правага ўхілу на практыцы, як з боку асобных зьвеньняў нашай партыі, так і асобных яе камуністых. Узмацненьне работы па лепшай арганізацыі беднаты і батрацтва ў сучасны момант набывае выключнае значэньне яшчэ і таму, што мы ў бліжэйшы час будзем мець яшчэ большае абвастрэньне клясавай барацьбы ў вёсцы ў зьвязку з кампаніяй перавыбараў саветаў і камітэтаў узаемадапамогі, якая набліжаецца.

Беднота, як апора пралетарыяту ў вёсцы, павінна поўнасьцю стаць актыўным правадніком палітыкі партыі ў вёсцы як па пасьпяховым правядзеньні задач сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, так і ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній.

М. МАНЖАЛЕЙ.

На Асінбудзе заканчваюцца работы першай чаргі



Пабудова раб. пасёлку на Асінстроі.

На Асінбудзе канчаюцца будаўнічыя работы першай чаргі. Заканчваецца ванапяненьне цэглай жалеза-бэтоннага корпусу галоўнага будынку станцыі; ужо ўстаноўлены фундаменты пад турба-генэратары, робяцца фундаменты для катлоў.

Ужо пачало паступаць замежнае абсталяваньне, і ў лістападзе пачнецца мантаж машын.

На палову выкананы работы па пабудове **вадаправоднага каналу з возера** Арэхі. Работа праводзіцца ў цяжкіх умовах балотнага грунту.

Хуткім тэмпам праводзяцца работы па ўстаноўцы лініі перадачы току на Віцебск, Воршу, Шклоў і Дуброўну. Лінія перадачы току высокага напружаньня амаль гатова. Заканчваюцца пабудовы паніжальных падстанцый у Віцебску, Воршы і Дуброўне.

Акрамя будаўнічых работ першай чаргі, вядзецца падрыхтоўка да пабудовы корпусу для другой чаргі станцыі.

Дазволена ўстанавіць трэці турба-генэратар на 12 тысяч клв; кіраўніцтва станцыі хадайнічае аб дадатковай устаноўцы яшчэ 2-х турба-генэратараў па 12 тысяч клв.

Ня мала ўвагі зьвернута на пабудову рабочага пасёлку ў Арэхах. Пасёлак будуецца па тыпе **гораду-саду.** Дамы абсталяваны цэнтральным ацяпленьнем, вэнтыляцыяй, водаправодам і каналізацыяй. Акрамя кватэр для рабочых, будуць пабудаваны больніца, лазьнярыня, сямігодка, тэатр, абсталяваны дзіцячы сад, ясьлі, спартыўныя пляцоўкі, паркі і г. д. Дагэтуль ужо пабудаваны 8 трохпавярховых камянніц.

Побач з падрыхтоўкай прамысловых спажыўцоў электраэнэргіі, кіраўніцтва Асінбуду зьвярнула шмат увагі і на пытаньні **сельска-гаспадарчай электрыфікацыі.** Ужо складзены праекты электрыфікацыі Віцебскага, Аршанскага і Дуброўенскага с.-г. раёнаў, якія атрымаюць ток ужо ў 1930 годзе.

Электрыфікацыя сельскай гаспадаркі дасьць магчымасьць ужываць складаныя сельска-гаспадарчыя машыны і тым дасьць моцны штуршок да пераходу на калектыўнае зямлякарыстаньне.

Адна з прычын, якая паніжае рэнтабэльнасьць сельскай электрыфікацыі, зьяўляецца раскіданасьць насельніцкіх пунктаў, саўгасаў і калгасаў. Узбудаваньне калгасаў і саўгасаў скароціць даўжыню лініі перадачы току і тым значна вынізіць кошт праводкі электрасеткі.

Р.

ЯК КІРУЕ МЭТАЛЯТРЭСТ ЗАВОДАМ „КАМУНАР"

Завод «Камунар» — новы завод. Ён мае буйныя дасягненьні. Дзякуючы рацыяналізацыі і сацспаборніцтву, вытворчая праграма выканана на 109%, выніканьне сабекошту ў 4-м квартале дасягнула 10,8%. Ёсьць яшчэ цэлы рад дасягненьняў.

Але бяда толькі ў тым, што амаль уся работа заводу тармазілася Белмэталятрэстам. 24-га кастрычніка на заводзе **«Камунар»** адбыўся сход парткалектыву, на якім з досыць грунтоўным дакладам выступіў дырэктар заводу тав. Левін. З дакладу выявілася, што ўзаемаадносіны паміж заводам «Камунар» і Мэталятрэстам самыя дрэнныя. Трэст ня толькі не данамагаў, а нават перашкаджаў працаваць заводу. У той час, калі іншыя заводы задыхаліся ад перагрузкі, калі «Энэргія» друкавала абвесткі аб тым, што ёй патрэбны сьлесары, дык завод «Камунар» ставіў пытаньне аб скарачэньні 50 кваліфікаваных сьлесароў.

Хто-ж быў вінаваты ў гэтым? Трэст. Ён адмаўляўся даваць «Камунару» заказы, тлумачачы гэта тым, што нібы заказаў няма. І толькі пасьля таго, калі націсьнулі на трэст праз ВСНГВ, заказы адразу зьявіліся.

Трэст павінен быў даць заводу пэўную колькасьць варштатаў. Але завод іх не атрымаў толькі таму, што трэст надта нядбайна, бюракратычна аднёсься да гэтай справы: завод прадставіў у трэст заяўку на неабходнае абсталяваньне, трэст гэту заяўку згубіў. Трэст павінен быў перадаць заводу «Камунар» два вінтарэзныя варштаты, дзеля чаго паслаў заводу копію ліста, накіраванага мясцовай канторай УМТС, каб яна перадала гэтыя варштаты заводу. Копію ліста «Камунару» атрымаў своячасова, а выканаўца УМТС листу не атрымаў... У тытульны сьпіс абсталяваньня заводу на 29-30 год трэстам унесены фрыкцыённыя прэсы і токарныя варштаты, гэта такое абсталяваньне, якога завод «Энэргія» ня зробіць за гэты тэрмін. Зусім не рэальныя пляны капітальнага будаўніцтва заводу «Камунар». Склаў трэст: ня скончаны корпус кузьні, малы і не здавальняе вытворчых патрабаваньняў заводу. Трэст не абдумаў дэтальнага пляну фабрыкі бляхі, якая будзе будавацца пры заводзе, у выніку чаго фабрыка застанецца на ўзроўні саматужнага прадпрыемства. Завод ня ведае пэрспэктыў свайго разьвіцьця на пяцігодцы. Такая бяспэрспэктыўнасьць у працы адбіваецца на становішчы заводу. Ён ня ведаў ці будзе завод расьці, ці не. Гэтае становішча не дае правесьці рад неабходных мерапрыемстваў.

У спрэчках рабочы заводу «Камунар» тав. Эпштэйн завастрыў на гэтых фактах увагу ўсяго сходу. Цяжка працаваць, гаварыў ён, калі трэст ня толькі намі ня кіруе, але нават перашкаджае нашай працы. Рабочыя Гобэрман і іншыя працу трэсту называлі бюракратычнай. Як, калі не бюракратызмам, можна назваць такі факт. Мэталятрэст доўгі час лічыў завод на правах працкалектыву. Галоўны інжынэр трэсту Сульскі вось што заявіў: «Что вы хотите? вас не признают и вас приходится содержать только лишь подачками». Дзякуючы такім адносінам трэсту, зрывалася спаборніцтва, бо трэст не даваў заказаў, завод стаяў і, урэшце, прыйшлося плаціць рабочым за прастой.

Калі завод павінен быў здаць заходня-абласной канторы УМТС партыю ціскоў, то, ня гледзячы на тое, што на заводзе ёсьць добрыя спэцыялістыя (інжынэр і некалькі тэхнікоў), УМТС вынес заводу «вотум недавер'я» і прыслаў для прыёмкі ціскоў... рахункавода!

Пасьля дакладу тав. Левіна і выступленьняў рабочых, выступіў нам. дырэктара Мэталятрэсту тав. Любамірскі, які даводзіў, што трэст ня мае «сынкоў і пасынкаў»

Прывітаньне ЦК КП(б)Б

Урачысты сход, прысьвечаны звальненьню з радоў РСЧА №-скай Авіябрыгады, шле баявое, гарачае прывітаньне ЦК Ленінскай партыі бальшавікоў Беларусі.

Двухгадовая вайскова-палітычная вучоба ў радох Чырвонай армії выкавала з нас стойкіх і адданых абаронцаў пралетарскай дзяржавы, адданых будаўнікоў сацыялізму і праваднікоў мерапрыемств партыі і ўлады ў горадзе і вёсцы.

Адыходзячы на заводы і фабрыкі, вярочаючыся ў свае вёскі, мы даем абяцаньне рашуча праводзіць генэральную лінію партыі, падымаць прамысловасьць, будаваць калгасы, выкарыстоўваючы ў сваёй рабоце мэтад сацыялістычнага спаборніцтва.

Нам не па дарозе з ныцікамі і малаверамі, мы цьвёрда ўлэўнены ў бязумоўнай лініі партыі. Мы за генэральную лінію партыі, мы за ленінскае адзінства перадавога атраду Камінтэрну—УсеКП(б).

Няхай жыве правадыр і арганізатар РСЧА—партыя Леніна!

Мы будзем дазорнымі калектывізацыі вёскі

Мы будзем гатовымі кожную мінуту вярнуцца ў Чырвоную армію

(Рэзалюцыя сходу адпускнікоў - чырвонаармейцаў Белар. стр. дывізіі)

Мы, адпускнікі №-й Стралковай Беларускай дывізіі, сабраўшыся на агульны сход, прысьвечаны задачам чырвонаармейца - адпускніка адзначаем:

Звальненьне нас з Чырвонай арміі праходзіць у часе напружанага міжнароднага становішча, у часе абвостранае ваеннае небясьпекі (напады кітайскіх бандытаў на нашы межы). Мы заўважаем, што і ў водпуску мы будзем заўсёды гатовы па першым закліку камуністычнае партыі стаць у рады Чырвонай арміі. Мы ў вёсцы будзем актыўна працаваць у АСО, вайсковых гурткох і іншай рабоце па ваяізацыі насельніцтва.

Мы прыходзім у вёску ў часе вялікага наступленьня сацыялістычных элемэнтаў на капіталістычныя, у часе напружанае работы кампартыі па калектывізацыі вёскі. Мы заяўляем, што партыя спатнае ў нас актыўных прыхільнікаў калектывізацыі. Мы бяром на сябе задачу быць дазорнымі калектывізацыі вёскі. Сьвежым чырвонаармейскім струменем мы яшчэ больш ажывім работу груп беднаты, павялічым тэмп хлебазагатовак, узмоцнім удар па кулацтве.

У Чырвонай арміі мы атрымалі ня толькі веды вайсковыя, мы ня толькі навучыліся быць стралкамі, кулямётчыкамі і артылерыстымі. Мы ў Чырвонай арміі навучыліся быць трактарыстымі, калгаснікамі, каапэратарамі, антырэлігійнікамі, работнікамі асьветы і г. д. Сапраўды, Чырвоная армія была для нас ня толькі школай баявога, але і камуністычнага выхаваньня. Мы абяцаем усе нашы веды поўнасьцю скарыстаць для справы сацыялістычнага будаўніцтва, для ўзмацненьня баяздольнасьці краіны.

Мы выносім сваю чырвонаармейскую падзяку ўсім арганізацыям, якія прымалі ўдзел у нашай падрыхтоўцы да звальненьня. Мы з іх боку адчувалі шчырае жаданьне зрабіць нас актыўнымі ўдзельнікамі сацыялістычнага будаўніцтва. Мы заяўляем, што гэтая іх праца намі будзе апраўдана.

Мы абяцаем трымаць шчыльную сувязь з часьцямі дывізіі. Мы ўсёй сваёй работай будзем узьнімаць аўтарытэт Чырвонай арміі. Мы будзем сачыць, каб у нашу Чырвоную армію не пралез варожы нам элемэнт.

НЯХАЙ ЖЫВЕ КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ — ПРАВАДЫР І АРГАНІЗАТАР ЧЫРВОНАЙ АРМІІ!

НЯХАЙ ЖЫВЕ СУСЬВЕТНЫ КАСТРЫЧНІК!

Забытая ўсімі вытворчасьць

Белмясгандаль, па даручэньні ўрадовых органаў, з сакавіка пачаў арганізацыю вырабу маргарынавага масла.

Працаўнікі, якім была даручана арганізацыя, мала клапаціліся аб тым, каб хутчэй абсталяваць вытворчасьць. Дырэкцыя Белмясгандлю вельмі мала цікавілася справай, фармальна выконвала заданьні вышэйшых органаў. У выніку замест трох, максымум чатырох месяцаў фабрыка па вырабе маргарыну абсталёўвалася на працягу 7 месяцаў.

Зараз на маргарынавай вытворчасьці занята 7 чалавек. Саюз і адміністрацыя да гэтага часу не паклапаціліся заключыць калдагавор, рабочыя працуюць бяз вопраткі, няма аптэчкі і ручнікоў.

Рабочыя сыстэматычна спазьняюцца на работу. Адкіды, якія складаюць 30 проц. агульнай колькасьці тлушчу, выкідаюцца ў сьмецьце ў той час, калі іх можна рэалізаваць. Стэарын ляжыць у кучы і плясьнівее. Сырэц на прадпрыемства дастаўляецца вельмі неакуратна.

Інжынэр Лабановіч, які адказвае за арганізацыю вытворчасьці, удзяляе ёй максымум 10 мінут на дзень.

Адпаведныя органы павінны зацікавіцца гэтай справай.

Д.

Што сапраўды было ў ЦДС?

У Цэнтральным доме селяніна выкрыты цэлы рад ненармальнасьцей: п'янства, распуста, склокі, зажым самакрытыкі і г. д. У ЦДС склаліся надзвычайна цяжкія ўмовы для працы. Сяляне нават баяліся начаваць. Паміж супрацоўнікамі разгарнуліся склокі і ледзь не даходзіла да чубоў, антысэмітызму. Праца культала на абедзьве нагі Былы нам. загадчыка ЦДС т. Філановіч па пастанове бюро парт'ячэйкі быў зьняты з працы за бюракратычныя адносіны да працы, да сялян і г. д. Ён заўсёды запалохваў прыбральшчыц, што прыдзе камісія з НКЗ і пачне праводзіць скарачэньне. Бедныя прыбральшчыцы са скуры лезьлі, але цёрлі ўжо даўно выцертыя сьцены.

Першы нумар насьцянгазэты рашуча ўдарыў па бюракраце Філановічу. Пасьля заметак ён прыбральшчыц аганяе ў прыбральні і з кулакамі патрабуе сказаць, хто аб ім напісаў у газэту.

На апошнім сходзе цэлы рад таварышоў, якія выступалі, гаварылі пра дрэнныя паводзіны былога нам. загадчыка Філановіча і камэнданта Голасава.

Камэндант дому т. Голасаў надзвычайна грубы чалавек прыводзіў у дом прастытутак, ад прыбральшчыцы Манушка вымагаў, каб яна паставіла яму літр. Апошняя вымушана была падпарадкавацца «начальству». Езьдзіў да яе на кватэру, а разам з гэтым хацеў яе згвалціць.

У другую работніцу т. Голасаў запусьціў графінам, калі не дабіўся ад яе згоды. Называў прыбральшчыц «кабыламі», «вагонамі», і інш.

Голасава з працы ў ЦДС зьнялі. Толькі не ўзгадніли пытаньня з урадовай камісіяй, дзякуючы чаму заварылася зноў каша. Інспэкцыя працы патрабавала аднаўленьня на працы Голасава. Апошні на працы адноўлен ня быў.

Трэба адзначыць, што адміністрацыя правільна падышла да зьяўцаў з працы т. Голасава. Віна яе ў тым, што яна не ўзгадніла звальненьне з належнымі ўстановамі. Суд усё-ж бюракратычна падыйшоў да вырашэньня гэтае справы. Голасава на працы аднавілі.

Зараз у ЦДС поўная дэзарганізацыя, працдысцыпліна падае. Агульны сход патрабуе зьняць Голасава з працы ў ЦДС. Адміністрацыя вадзілася за чубы, а праца ішла самацёкам.

У практычнай рабоце ЦДС, які падпарадкаваны НКЗ, меў месца правы ўхіл. Гутаркі, якія праводзіліся з сялянамі, мелі характар правага ўхілу ў адносінах хутарызацыі. Сацыялістычны сэктар у музэі адсутнічае. На паперы то сацыялістычны сэктар арганізоўваецца, а на справе не. Уся віна па арганізацыі сацыялістычнага сэктару падае на адміністрацыю і агранома ў.

Разам з гэтым жонка т. Клімава бывае, што ўмешваецца ў працу ЦДС. Адзін раз яна нават назвала селяніна бандытам за тое, што яе сын хацеў ты калаць яму вочы. Рашучага рэагаваньня на ўсе ненармальнасьці ў ЦДС з боку т. Клімава і палітінструктара т. Сіўко ня было. Бібліятэка на працягу 3-х з паловай месяцаў не працавала. Літаратуры на яўрэйскай мове ў бібліятэцы ня было.

Пастанова НК-РСІ ад 15 жніўня аб перагляде складу працаўнікоў ЦДС і аб пастановым аднаўленьні—ня выканана. Мясцком нічога ня робіць.

Трэба ў тэрміновым парадку аздаравіць апарат ЦДС, выкінуць усіх тых, што разлажыліся, ачысьціць атмасфэру ад гнілога і непатрэбнага. Абнавіць мясцком, які ня ўжыў ніякіх захадаў, каб зьнішчыць склокі, не праводзіў культурна- выхаваўчай работы сярод адсталай групы рабочых.

Ул. Б.

Камісія па чыстцы, зірні яшчэ раз у Белсампрамсаюз

Белсампрамсаюз зьяўляецца прытулкам для выкрытых і выкінутых з каапэрацыйнага апарату шкоднікаў.

Былы бухгалтар БСІКА Рабіновіч, які займаўся жульніцкімі махінацыямі, быў звольнены з працы і прыцягнуты да крымінальнай адказнасьці. Зараз ён працуе ў Белсампрамсаюзе. Не пасьпеў ён атрымаць у БСІКА канчатковы разьлік ,як яго ўжо прынялі ў апарат саматужнай каапэрацыі.

Камісіі на чыстцы трэба будзе яшчэ раз зірнуць у Белсампрамсаюз.

Н.

„Бесьперапынная" цяганіна

У пэчатку кастрычніка Менская біржа працы перайшла на бесьперапынку. Яна не прыстасавала работу да новых умоў, і ў сувязі з гэтым пачалася бесьперапынная цяганіна.

Возьмем, напрыклад, рэгістрацыю картак беспрацоўных. Прыходзіць беспрацоўны ўзяцца на вучот пасьля часовай работы, шукае рэгістрацыйную картку і не знаходзіць яе. Пакуль знойдуць старую картку, праходзіць месяц, а беспрацоўны кожны дзень ідзе на біржу пытацца аб лёсе карткі.

У чым справа?

На працягу 6 дзён у месяць сталы супрацоўнік адпачывае, часовы намесьнік так заблытаў карткі, што іх цяжка знайсьці.

Ці нельга было так наладзіць дзелаводзтва, каб унікнуць цяганіны.

Д. В.

БССР напярэдадні 12 гадавіны Кастрычніка

Акругі рыхтуюцца да сьвята

◎ У Магілеўскай акрузе ў дні сьвяткаваньня будуць наладжаны экскурсіі рабочых у калгасы-гіганты Клімавіцкага раёну. Экскурсанты-рабочыя прымуць удзел у арганізацыі і правядзеньні пралетарскага сьвята ў калгасах. Буйнейшыя калгасы пачнуць сацыялістычнае спаборніцтва.

◎ У Віцебску да 7-га лістапада прыстасоўваецца адкрыцьцё клюбаў мэталістых, швэйнікаў, камунальнікаў. Пасьля рамонту адкрываецца клюб фабрыкі «Дзьвіна». Пачынае работу радыё-станцыя акруговага бюро прафсаюзаў. Швэйнікі ў дзень Кастрычніка адкрываюць новы фабзавуч.

Завод «Чырвоны Мэталісты» і панчошная фабрыка імя Клары Цэткін рыхтуюць вытворчую выстаўку дасягненьняў па сацыялістычным спаборніцтве. У часе сьвята будуць арганізаваны экскурсіі швэйнікаў на набудову новай швэйнай фабрыкі. Да 7-га лістапада малочны саюз канчае набудову 2-х алейных заводаў у Гарадоцкім і Езярышчанскім раёнах. Заводы будуць выпускаць да 2.500 літраў алею ў дзень.

◎ У Бабруйску да Кастрычніцкага сьвята прыстасоўваецца афармленьне дагавароў аб шэфстве і сацспаборніцтве прадпрыемстваў з калгасамі і саўгасамі, клюбаў з хатамі-чытальнямі. Намячаецца пуск гарадзкога ваданраводу. 7-га лістапада адбудуцца грандыёзная дэманстрацыя і карнавал.

У гэты дзень будзе праведзена масавае наведваньне рабочымі казармаў, арганізаваны выезды ў падшэфную вёску і г. д.

◎ У Гомелі 12-я гадавіна Кастрычніка будзе адзначана адкрыцьцем новых навучальных устаноў, сталовак у Рэчыцы і Нова-Беліцы.

Мопр—у Кастрычніцкія сьвяты

Менакрыгком МОПР'у другі раз зварачаецца да ўсіх ячэек МОПР'у Менскай акругі, у зьвязку з надыходзячым сьвятам 12-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі, асабліва шырока скарыстаць усе гутаркі ў часе абедзеных перапынкаў на прадпрыемствах, сходы, вечары і калектыўныя вячэры на прадпрыемствах, установах і клюбах для растлумачэньня ролі мопраўцаў, як удзельнікаў масавай палітычнай баявой арганізацыі ў рэканструкцыйны пэрыяд сацыялістычнага будаўніцтва Савецкай краіны.

Кастрычніцкія сьвяты павінны быць шырока скарыстаны ячэйкамі МОПР'у для напамінаньняў працоўным аб зьняволеньні 80.000 лепшых нашых братоў і сёстраў у палоне ў буржуазна-фашыстоўскіх турмах. Мопраўскія ячэйкі павінны заклікаць усіх працоўных на дапамогу МОПР'у ў правядзеньні кампаніі ўсесаюзнага агляду мопраўскіх ячэек, зімовай кампаніі дапамогі палітзьняволеным і іх сем'ям, вярбоўкі новых членаў МОПР'у, асабліва на вёсцы і шырока папулярызаваць пэрыяд спаборніцтва ў зьвязку з заключэньнем дагавору на спаборніцтва паміж Менскім і Гомельскім акругкомамі МОПР'у.

Ц.

Рабочы заводу «Энэргія» т. Паўлоўскі зрабіў шмат карыснага ў оправе ўдасканаленьня сьвідравальных варштатаў. Тав. Паўлоўскі выдумаў спэцыяльную прыладу, якая працуе пры дапамозе электрычнасьці для пракручваньня дзірак у чыгунных плітах сьвідравальных варштатаў, што дало вялікую эканомію сродкаў. Тав. Паўлоўскаму бюро па справах вынаходзтва выдала пасьведчаньне аховы. На здымку: патрон т. Паўлоўскага ў часе працы.

Асоавіяхім да Кастрычніцкіх сьвят

Па ўсіх ячэйках Асоавіяхіму ідзе падрыхтоўка да правядзеньня Кастрычніцкіх сьвят. Арганізуюцца выстаўкі вайсковай кнігі, па ўсіх прадпрыемствах будуць праведзены даклады на вайсковыя тэмы. Усе батальёны і вайсковыя гурткі Асоавіяхіму прымуць удзел у парадзе.

Пераклічкі гарадсоў і рапарты па радыё

Цэнтральная камісія пры ЦВК БССР выпрацавала плян радыё-абслугоўваньня працоўных у часе Кастрычніцкіх сьвят.

6-га лістапада будзе наладжаны абмен радыё-прывітаньнямі паміж сталіцамі СССР.

7-га адбудзецца ўсесаюзная пераклічка гарадоў: Масква, Ленінград, Харкаў, Арцёмаўск, Менск, Тыфліс, Варонеж і г. д.

У гэты-ж дзень радыё-рапарт беларускаму ўраду. Рапартуюць ВСНГ, НКЗ, НКА, Белкалгассаюз і Белкаапсаюз. У рапартах будуць адзначаны дасягненьні у сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі.

Пасьля трансляцыі рапартаў буйных пабудоў Саюзу ўраду СССР, трансляцыя канцэртаў з Масквы і прывітаньняў замежных дэлегацый.

Увечары—канцэрт беларускага радыё-цэнтру ў клюбе Карла Маркса.

„Памылкі" інж. Мазгалеўскага

Часта, калі вычарпаны ўсе агрумэнты для апраўданьня «некаторых недахватаў», тады зварачаюцца да апошняга:

Што-ж, на памылках мы вучымся.

Зразумела, адхіліць начыста памылкі ў нашай новай і вялікай рабоце нельга: яны будуць сустракацца. Аднак, ці не пара нам абвясьціць барацьбу аматарам хаваньня за гібкую формулу: «На памылках мы вучымся». Нам здаецца, што пара, бо многія памылкі ў двукосьсях нічым ня могуць быць апраўданы і пацьвярджаюць толькі тую ісьціну, што ў каго-кольвек ёсьць жаданьне ўпарта прытрымлівацца абломаўскіх мэтадаў работы. Ня рызыка ў пошуках новага, ня імкненьне працаваць найлепш, а злачынны кансэрватызм і разгільдзяйства зьяўляюцца глебай для гэтага гатунку памылак.

Дзейнасьць інжынэра Мазгалеўскага зьяўляецца тыповай і характэрнай у гэтым сэнсе. Ён — інжынэр-будаўнік. Мы ня зьбіраемся даваць ацэнку яго сапраўднай кваліфікацыі. Скажам, толькі ў дужках, што раней Мазгалеўскі спэцыялізаваўся на пабудове царкоўных будынкаў і, як кажуць асьвядомленыя людзі, будаваў іх ня дрэнна. Цяпер, як вядома, царкоўная архітэктура не ў пашане і інжынэр Мазгалеўскі займаецца грамадзянскай будоўляй, знаходзячыся на службе ў Белдзяржбудзе.

Але-ж так і быць: ня будзем напамінаць старога. Заўважым толькі, што тады, у старыя часы, за Мазгалеўскім, здаецца, не наглядалася такіх фатальных памылак. Зараз-жа памылкі ідуць за ім неадступна, ператвараючы яго работу ў адну вялізарную памылку: ён зрабіў бесьсьмяротным сваё імя, як творца халоднага цэнтральнага ацяпленьня.

Пяройдзем да фактаў. Інжынэр Мазгалеўскі будаваў ацяпленьне ў доме Белдзяржстраху — памыліўся; у доме Белкамунбанку — зноў памыліўся; на галянтэрэйнай фабрыцы — памыліўся. І, парэшце, у доме адпачынку ў Ждановічах — аб'яднаў усе свае ранейшыя памылкі ў новай, якая пакідае далёка за сабою ўсе папярэднія.

Фатальнасьць. Інжынэра Мазгалеўскага прасьледуе нейкі злы бог памылак. Як кажуць, ён абавязкова павінен пасьлізнуцца «на свтом самом месце».

Інжынэр Мазгалеўскі выпрацаваў сабе пастаянную схэму: пабудаваць—перабудаваць... два-тры разы, па перайначаным прыслоўі: адзін раз зрабі, а сем перабляй.

Мы пакідаем у баку ўсе ранейшыя ацяпляльныя экспэрымэнты нашага славутага інжынэра. Спынімся толькі на апошнім — жданавіцкім. Па сутнасьці, аднаго гэтага экспэрымэнту досыць для таго, каб яшчэ пры жыцьці пабудаваць помнік інжынэру Мазгалеўскаму (калі гэта ідэя будзе падхоплена, мы прапануем наступны праект эпітафіі: «Вялікаму творцу архаічных ацяпляльных сыстэм ад удзячных замярзаючых жыхароў»). Ждановіцкі пэдэяр інжынэра Мазгалеўскага засланіў усё тое, што мелася ў яго ацяпляльнай практыцы даготуль. Патрабавалася больш году, каб перабудаваць яго славутую сыстэму «халоднага ацяпленьня». Але, трохі пасумаваўшы, Белдзяржбуд эпічна парашыў: «што-ж на памылках мы вучымся». І распачаў работу па перабудове ацяпленьня. Усё гэта абыйшлося Белдзяржбуду ў досыць круглую суму (да рэчы, на наша запытаньне аб выдатках, Белдзяржбуд палічыў патрэбным ад адказу ўстрымацца). Але найбольш пацярпеўшай ад экспэрымэнтаў Мазгалеўскага была Менская акрстрахкаса. Мы ўжо ня кажам пра тыя лішнія сем тысяч рублёў, якія страціла страхкаса, дзякуючы зрыву ўсіх тэрмінаў на здачы дому Белдзяржбудам. Але і тут ёсьць палітычны бок справы: страхкаса на працягу двух зімовых сэзонаў не магла пасылаць на адпачынак членаў саюзу. Зразумела, што за гэта яе палітычны капітал ня ўзрос.

І ўсё гэта таму, што інжынэр Мазгалеўскі пабудаваў ацяпленьне дому па сыстэме праф. Паўлоўскага, якая, паводле слоў спэцыялістых, даўно ўжо здана ў архіў. Акт агляду ацяпленьня тэхнічнай камісіяй — гэта найлепшы прысуд над Мазгалеўскім—інжынэрам. Здаецца, усё проста і ясна. Аднак, гэтая простая ісьціна каштавала Белдзяржбуду дзесяткаў тысяч рублёў, патрачаных на перабудову ацяпленьня. Праўда, Мазгалеўскаму нельга адмовіць у адсутнасьці складанасьці яго сыстэмы: у сутарэньні дому ён літаральна стварыў вялізарнае машыннае аддзяленьне з сыстэмай катлоў, прылад і труб, якое магло скласьці гонар цэламу заводу. Аднак, гэтая «складанасьць» выявіла сябе пры першай спробе пуску ацяпленьня: тэмпэратура ў пакоях ледзь-ледзь даходзіла да 9 градусаў, а ў кацёльнай яна дасягала 70 і больш градусаў. Маленькая дэталь: для таго, каб кіраваць ацяпленьнем Мазгалеўскага, качагар павінен быў прайсьці спэцыяльныя курсы, так яна была заблытана.

Калі нядаўна камісія РСІ аглядала дом у Ждановічах, там ужо ад сыстэмы Мазгалеўскага бадай нічога не засталося. Толькі на дварэ каля сьцяны дому валяліся катлы, помпы, трубы — маўклівыя сьведкі яго шкодных экспэрымэнтаў. У сьветлых, вялікіх пакоях дому адчуваўся пах сьвежай фарбы і цеплаты, нармальнай 16-ці градуснай цеплаты, якую давала ўжо новая сыстэма інжынэра Адэльскага. Нас вадзіў па пакоях тэхнік. Ён гіранічна ўсьміхаўся і час ад часу, адказваючы на запытаньні членаў камісіі, ляканічна кідаў:

— Зразумела, так нельга было будаваць. Глядзеце, вось трубы старыя, а вось нашы... дымэтр іх павялічаны ў два разы... Павялічана плошча нагреву...

Так, цяпер усё ясна, нават для несьпецыялістага А раней? Яшчэ спачатку работы Мазгалеўскаму рабіліся заўвагі аб няправільнасьці радавымі рабочымі. І, аднак, здарылася тое, што было ўжо ня раз з Мазгалеўскім: ацяпленьне было скончана, аказалася нягодным, тэхнічна няпісьменным і было спачатку да канца перароблена.

Магчыма, што Белдзяржбуд і сам Мазгалеўскі цяпер разважаюць: «На памылках мы вучымся». Але зусім ясна, што падобных памылак дапушчаць ці апраўдваць мы ня можам. Трэба ўскрыць прыроду памылак у двукосьсях і паказаць, што паміж імі і простым шкодніцтвам мяжа стушоўваецца. Мы зноў падкрэсьліваем, што падобныя памылкі ня маюць нічога агульнага з няўхільнай рызыкай па ажыцьцяўленьні новых тэхнічных ідэй і замыслаў.

Зразумела, мы ня можам не паставіць запытаньня: чаму пры ўсіх гэтых шкодніцкіх экспэрымэнтах Мазгалеўскага, ён усё-ж-такі заставаўся на службе ў Белдзяржбудзе? Для нас зусім незразумела тое, што гэтага «інжынэра» кіраўнікі Белдзяржбуду прабавалі нават раіць галоўным інжынэрам будаўніцтва Дому Ураду? Мы думаем, што Белдзяржбуд дасьць адказ нашай грамадзкасьці.

Нельга не зрабіць некаторых агульных вываду са справы Мазгалеўскага. У нас ёсьць адказны лёзунг: дагнаць і перагнаць у тэхнічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны. Абсалютная большасьць нашай тэхнічнай інтэлігенцыі аддана працуе над ажыцьцяўленьнем гэтага лёзунгу партыі. Але ёсьць і такая невялічкая частка, якая імкнецца ўпарта затрымаць нас на пазыцыях старой тэхнікі, а часамі і проста шкодзіць нам. Для гэтай часткі наўмысныя «памылкі» ёсьць тактыка легальнага шкодніцтва.

Нам думаецца, што пад гэтую рубрыку падпадаюць і памылкі інжынэра Мазгалеўскага. Яго справа перадана органамі РСІ ў пракуратуру і інжынэр Мазгалеўскі павінен будзе адказаць перад пралетарскім судом. Мы ўпэўнены ў тым, што нашы судовыя органы высьветляць прыроду памылак Мазгалеўскага і адабяць ахвоту ў тых інжынэраў, якія абралі сваёй тактыкай сыстэматычныя «памылкі» за кошт савецкай дзяржавы. Кіраўніком Белдзяржбуду ўжо час зьмяніць сваю абломаўскую даверлівасьць на крытычны падыход да кожнага з сваіх спэцыялістых і цьвёрда гарантаваць грамадзкасьць ад злачынных практыкаваньняў накшталт інжынэра Мазгалеўскага.

ТЭХНІК.

Авантурыстка на службе у МЦРК

Загадчык крамы № 31 МЦРК тав. Моргэнштэрн, вельмі абрадаваўся, калі да яго прыслалі ў якасьці практыканткі Савіч Марыю, якая сябе выдавала за члена ЦКК і члена партыі з 1917 году.

Загадчык сьлепа паверыў ёй, нават зьвярнуўся да ўсіх працаўнікоў крамы: «Вось зараз у нас будзе ўсё добра, глядзеце, у нас працуе член ЦКК», а старшыня групкому МЦРК — тав. Коцік нават зьбіраўся рэкамэндаваць Савіч у апоргі парт'ячэйкі МЦРК.

Але, прапрацаваўшы два тыдні ў краме МЦРК, Савіч сваімі паводзінамі выклікала ў працаўнікоў, крамы падазрэньне наконт яе партыйнасьці і прыналежнасьці да членаў ЦКК.

А калі зьявіліся ў рэдакцыю «Зьвязда» па гэтай справе, дык расьсьледваньнем устаноўлена, што Савіч Марыля вядомая ў крымвышуку, якая ў 1924 годзе была засуджана на 2 гады і сядзела ў папраўчым доме за вымаганьне, ашуканьне доктара Заходняй чыгункі Аляксеева і за ілжывае прысваеньне сабе годнасьці сакрэтнага агента крымвышуку. Яна ніякіх адносін ня мае ня толькі да ЦКК, а нават і да партыі наогул.

Цікава адзначыць, што гэта авантурыстка Савіч фігуравала ў № 134 газэты «Рабочий», як член ЦКК па справе абсьледваньня крамы № 51 МЦРК па справе Бэкера.

Вось хто такая Савіч Марыля—звычайная авантурыстка і для яе ня можа быць месца ў МЦРК.

ЦУДЗІН.

Чыстка калегіі праваабаронцаў

Складзена камісія па чыстцы Менскай калегіі праваабаронцаў. Старшыня камісіі т Кіш (Менакрсуд), члены камісіі: т.т. Пушкоў (с.-г. выстаўка), Шрайбман (нарсуд 1-га вуч.), Сільнікаў (Менакопракуратура), Фрыдман (калегія праваабаронцаў).

Камісія просіць усіх працоўных гораду і Менскай акругі прыняць актыўны ўдзел у чыстцы, паведаміўшы камісію пра ўсе матар'ялы, якія дыскрэдытуюць таго ці іншага абаронцу.

Вусныя і пісьмовыя скаргі прымае тав. Кіш (Менакрсуд).

ЗА ДЗЕНЬ

Пленум саюзу хэмікаў. Чарговы пленум ЦП саюзу хэмікаў Беларусі назначаны на 14-га лістапада. У парадку дня —даклады аб калдагаворнай кампаніі і аб ходзе сацспаборніцтва. 12-га лістапада склікаецца нарада старшынь акраддзяленьняў саюзу па пытаньні аб калдагаворнай кампаніі.

Прыезд назад рабочай дэлегацыі. Учора вярнулася ў Менск дэлегацыя рабочых, якая выяжджала ў Маскву з чырвоным эшалёнам бульбы.

А. І. МОКІН

Пасьля цяжкой і доўгай хваробы памёр стары газэтны працаўнік Арсені Іванавіч Мокін.

Нябожчык з самага пачатку Кастрычніцкай рэвалюцыі працаваў у савецкім партыйным друку. На працягу 2-х год з 1925 па 27 г. ён займаў пасаду адказнага сакратара рэдакцыі газ. «Зьвязда». У апошні час ён працаваў сакратаром рэдакцыі газ. «Рабочий» і сакратаром камітэту па справах друку.

З радоў журналістых г. Менску выбыў працаўнік, які ўвесь час аддана і сумленна працаваў на карысьць партыйна-савецкага друку, які, не шкадуючы часу, сіл і здароўя, усяго сябе аддаваў газэтнай справе.

Група таварышоў.

Здарэньні

Машэньніцтва. Менскім Крымвышуком затрыманы нейкі Эдуард Шпілеўскі, які падаў у Менскі акругком КП(б)Б 9 заяў пад рознымі прозьвішчамі аб грашовай дапамозе. Шпілеўскі выдаваў сябе за члена КП(б)Б.

Затрыманы злодзей Кухарэнка, які зрабіў пакражу рэчаў з інтэрнату батрачак пры сьвінаводнай станцыі ў Сьляпянцы.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

АД ЦК І МЕНАКРУГКОМУ МОПР'у

З 1-га лістапада апарат ЦК і Менакругкому МОПР'у пераходзяць на бесьперапынны тыдзень.

Работа праводзіцца з 9 гадз. раніцы да 4 гадз. дня.

Сход Мен. філіі БелАПП

Сёньня, у пятніцу 1 лістапада, а 8 гадзіне ўвечары ў Доме Пісьменьніка адбудзецца агульны сход Менскае філіі Бел. АПП.

У парадку дня:

1. Разгляд і зацьвярджэньне пляну працы на 1929-30 г.

2. Заслухоўваньне і абгаварэньне «РАПАРТ'у» т. Броўкі

Увага: членам бюро філіі зьявіцца роўна ў 7 гадзін.

— БДУ. Сёньня. 1-XI-29 г., а 8 гадзіне ўвечары адбудзецца нечарговы адчынены сход яч. КП(б)Б падфаку пытаньнях. Аб новай вылазцы нацыянал - дэмакратаў і паводзінах члена ячэйкі т. Марука.

Яўка членаў і кандыдатаў КП(б)Б—абавязкова.

Бюро ячэйкі КП(б)Б пэдфаку.

ПЭДГАБІНЭТ

— Сёньня роўна а 7-й гадзіне ўвечары сход сэкцыі грамадзка-карыснай працы, самакіраваньня і піянэрруху ў школе.

ПАРАДАК ДНЯ: 1. Грамадзка-карысная работа школ, яе канкрэтныя віды і выхаваўчае значэньне (дакладчык т. Равін).

2. Бягучыя справы.

— Сёньня а 8-й гадзіне ўвечары заняткі гуртка па маляваньні і працы для дашкольніц.

— У суботу 2-га лістапада сход сэкцыі па анты-рэлігійным выхаваньні. Пачатак а 7-й гадзіне.

Яўка настаўнікаў, якія запісаліся ў сэкцыю—абавязкова

Менскі АК КП(б)Б просіць таварышоў, вылучаных на курсы, якія ня былі на нарадзе ў мінулую нядзелю, зьявіцца ў АК 3-га лістапада да 12-ай гадзіны раніцы (3-ці паверх, заля пасяджэньняў).

АПА Менакругкому КП(б)Б паведамляе, што пачаўся прыём заяў на завочнае навучаньне ў інстытуце чырвонай прафэсуры і камакадэміі. Правілы прыёму—у № 240 газ. «Правда» ад 17-га кастрычніка.

У суботу 2-га лістапада а 7-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні клюбу харчавікоў (Школьная 1) адбудзецца нарада прадстаўнікоў моладзі, ФЗМК і брыгадзіраў ударных брыгад саюзу харчавікоў.

У нядзелю, 3-га лістапада, а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні Фрунзаўскага райкому склікаецца раённая нарада жанарганізатараў. Яўка абавязкова.

У суботу, 2-га лістапада, а 7 гадзіне 30 мін. ўвечары ў Доме Камасьветы імя Карла Маркса адбудзецца вечар партактыву Менскай арганізацыі. Даклад тав. Стракоўскага: «Пяцігадовы плян індустрыялізацыі БССР». Пасьля дакладу — мастацкае адзяленьне.

Прадстаўніком ячэек зьявіцца за атрыманьнем білетаў у дом камасьветы штодня ад 12 да 3 гадзін дня і ад 6 да 9 гадзін увечары.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

Калектыў супрацоўнікаў рэдакцыі і канторы газэты «Зьвязда» выказвае свой глыбокі жаль з прычыны сьмерці б. супрацоўніка рэдакцыі

т. Арсенія Іванавіча МОКІНА

Вынас цела—сёньня, а 4 гадзіне дня з 1-ай сав. больніцы

Калектыў супрацоўнікаў рэдакцыі і канторы газэты «РАБОЧИЙ» выказвае свой глыбокі жаль з прычыны сьмерці б. сакратара рэдакцыі газэты

т. Арсенія Іванавіча МОКІНА

Вынас цела нябожчыка сёньня, а 4-й гадзіне дня з 1-й савецкай больніцы.

Групком № 4 Саюзу Працасьветы з вялікім жалем паведамляе, што сябра саюзу н-групному — настаўнік 23-й школы

тав. РУБІН Пэйсах Абрамаў,

пасьля кядоўгага часу хваробы памёр у 1 лячэбніцы у ноч з 29 на 30 кастрычн.

Пахаваньне адбудзецца сёньня, 1 лістапада а 2 гадз. дня

Вынас цела з першай лячэбніцы.

Просьба ад групкому № 4 да ўсіх асьветнікаў прыняць удзел у пахаваньні тав. Рубіна

Групком № 4 Саюзу Працасьветы

ТЭАТР і КІНО

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР

Пятніца, 1 лістапада. Спэктакль для рабочай моладзі. Білеты ў Доме Камсамолу

Субота, 2 лістапада. Спэктакль для саюзу будаўнікоў. Білеты ў саюзе і рабчкомах

Нядзеля, 3 лістапада. Адкрыты спэктакль. Білеты ў рабочай касе і ў касе тэатру

Д. Бергельсон — ГЛУХІ

А. Вавэрке — БОТВІН

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА — ПРЭМ'ЕРА. Вытворчасьць—„Межрабпом-фільм" — МАСТАЦКІ БАЯВІК. РАЗЛОМ. Звыш праграмы кіно-хроніка „Савкіно" № 56. Пачатак роўна а 7 г. увеч. Каса—ад 5 г.

КІНО Інтэрнацыянал — МАСТАЦКІ ФІЛЬМ — ЯК ЧАСАМ БЫВАЕ. драма ў 6 частках. Звыш праграмы: хроніка „Савкіно" № 58. Пачатак і сэансу а 7 г. 15 м. Каса—ад 5 г.

КІНО Пралетары — МАСТАЦКІ НЯМЕЦКІ ФІЛЬМ — ГОРНАЯ БАЛЯДА. драма ў 7 частках з пралёгам. Пачатак сэансаў роўна а 7 гадзіне ўвечары. Каса—ад 5 а пал. гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр" — Цікавы фільм вытв. „Совкино" Лясныя людзі (УАЭ). Краязнаўчы нарыс у 5 ч. Звыш праграмы кіно-хроніка „Совкино", прысьвечаная міжнароднаму юнацкаму дню ў Маскве. Каса адчыненае штодня ад 2 гадз. дня. Па нядзелях і сярэдах ад 12 гадз. дня. Пачатак 1-га сэансу ад 2 гадз.

КІНО СпартаК — Гастролі папулярных сатырыкаў С. М. і М. Г. Гудалавых (—) НА ЭКРАНЕ (—) ОСІ ДОВАЛЬД у выдатн. фільме ГЭТА МОЙ ЖАНІХ. камэдыя ў 6 част. Каса—ад 5 г. Пачатак 1 сэансу а 6 г. 30 м

Сёньня, заўтра і ў нядзелю АПОШНІЯ 3 ГАСТРОЛІ ІЛЮЗІЯНІСТАГА-ГІПНАТЫЗЁРА КАСФІКІС. ЦЫРК. Масавы гіпноз, вазэ Фараона. Зьяўленьне ўсяго штату на вачох у публікі. Зусім новыя вопыты. КАНЦЭРТНАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ ўпоў запрошаных артыстых Маскоўскай і Ленінградзкай эстрады. Пачатак а 8 з пал. гадз. увеч.

АБВЕСТКА. Інспэктар простых падаткаў Чэрвен